**Алесь Бяляцкі**

# Літаратура і нацыя

Менск
1991

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА І БЕЛАРУСКАЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ ГРАМАДА

Залатым дзесяцігодзьдзем беларускай літаратуры можна лічыць пэрыяд ад 1905 па 1915 год. У гэты час у беларускае прыгожае пісьменства назаўсёды ўвайшлі добры дзесятак творцаў, якія заклалі магутныя падваліны новай беларускай літаратуры. На зробленае імі і зараз гледзімо з захапленьнем і павагаю. Купала, Багдановіч, Колас, Гарун, Гарэцкі, Бядуля — суквецьце імёнаў, якому можа пазайздросціць любое літаратурнае пакаленьне. Своеасаблівы выбух у новай беларускай літаратуры абумоўлены грамадзкай сітуацыяй, што склалася на той час у Беларусі. Спынімся на гэтым больш падрабязна.

Цяжка знайсьці больш меньш працяглы пэрыяд на Беларусі пасьля яе анэксіі Расеяй у канцы XVII ст., каб на гэтай зямлі было зацішша. 1812-ы, 31-ы, 48-ы, 63-і, затым замах Грынявіцкага, і вось — пачатак новага стагодзьдзя — няўтаймаванае новае пакаленьне. Найбольш адукаваныя адплюшчваюць вочы астатнім. Як адзначае адзін з гісторыкаў, удзельнік ранейшых падзеяў, "сацыялістычныя ідэі на Беларусі да пачатку XX ст. ужо мелі шмат прыхільнікаў: не было ніводнага места, ніводнага мястэчка, дзе б не існавала якая-небудзь рэвалюцыйная група".

Выразную адметнасць мела і нацыянальная структура края, што моцна адбівалася на сацыяльна-эканамічным разьвіцьці розных этнічных групаў і ў сваю чаргу уплывала на ўмовы разьвіцьця беларускага нацыянальнага адраджэння. М.Поташ у кнізе "Бальшавізм і дробнабуржуазныя партыі ў рэвалюцыі 1905 г. у Беларусі", выдадзенай у 1931 годзе, акрэсьліў становішча наступным чынам: "у вёсцы (памешчык пераважна паляк або апалячаны беларус, селянін — пераважна беларус...) і ў горадзе (буржуазія галоўным чынам яўрэйская і часткова польская і менш беларуская, рускае чыноўніцтва, рабочыя, у значнай ступені яўрэі, затым беларусы, палякі і рускія)."

Беларусы пры гэтай раскладцы ўяўлялі найбольш вялікую і прыгнечаную частку грамадзтва — сялянства (нават сярод пралетарыяту і паўпралетарыяту, па падліках гісторыка М.Біча, на пачатак стагодзьдзя беларусы складаюць усяго толькі 17,1 прац.). Сялянская нацыя. А як жа буржуазія? Выбіваўся ж той-сёй з беларусаў у людзі. Паслухаем гісторыкаў: "Прамысловая і фінансавая буржуазія, якая зьяўлялася на Захадзе застрэльшчыкам нацыянальнага руху, на Беларусі гэтага заданьня выканаць не магла, з той простай прычыны, што яна з беларускасцю нічога супольнага ня мела, што яна пачувалася да супольнасьці з польскім або рускім народам і ўключалася ў

рады польскіх нацыяналістаў або рускіх вялікадзяржаўных шавіністаў", — піша Вінцук Склубоўскі. Так, а што ж інтэлігенцыя? На гэта адказваюць самі адраджэнцы. Па словах публіцыста Лявона Гмырака, інтэлігенцыя краю складалася "с памешчыкоў-палякоў, і апалячэўшых, с чыноўнічэства расейскаго і абруселаго ды мешчанства часьцю абрусе лаго, часьцю апалячэнаго".

Вось жа такая сітуацыя й вызначала шляхі разьвіцьця нацыянальна-вызвольнага руху беларусаў. Усялякія спробы ў вырашэньні нацыянальнага пытаньня беларусаў непазьбежна прыводзілі да іхняга сацыяльнага статусу ў грамадзтве. Як заўважаў Язэп Лёсік, "буржуазныя станы на Беларусі стаялі зусім абасоблена ад асноўнага, сялянска-земляробскага насяленьня. Гэтая абасобленасьць ня меньш кідалася ў вочы з боку культурнага, як з боку эканамічнага. Працоўныя масы гаварылі пабеларуску, а камандныя, эканамічна пануючыя станы — папольску або парасійску".

Дарэчы, з гэтай этнічнай сітуацыі на Беларусі і вынікае тэорыя адзінай плыні, адзінства беларускай нацыі, якая спрэс складалася з сялянства. Савецкія псэўдагісторыкі механічна пераносілі схему клясавага раздзялення нацыі з расейскае глебы на. Беларусь, не зважаючы на істотныя адрозненьні, якія мы пералічылі вышай.

Зразумела чаму нацыянальны беларускі рух адбіваў інтарэсы сялянства, якое зьяўлялася ягонаю асноваю, на якое ён і мог абаперціся ў будучыні. Менавіта гэта рабіла яго адпачатку дэмакратычным, прагрэсіўным, маючым вялікую пэрспэктыву.

* * *

Першай сьвядомай нацыянальнай арганізацыяй быў "Кружок Беларускае Народнае Асветы", які ўтварылі ў 1902 годзе ў Пецярбурзе беларусы-студэнты. Памкненьні займацца чыста культурна-асветніцкаю працаю пры сутыкненні з рэчаіснасьцю, з сістэмаю, перайначыліся. Згадвае адзін з сяброў гуртка: "Першыя крокі гуртка былі чыста культурнага характару: імкненнем яго была культурна-прасьветная праца сярод беларускага сялянства ў роднай мове, пісанне і друкаванне беларускіх кніжак, азнаямленьне грамадзянства і асабліва моладзі з беларускай гісторыяй і этнаграфіяй... Але тут жа сустрэўся (гурток — А.Б.) з непераможнымі перашкодамі, якія і папхнулі больш радыкальныя элементы на шлях рэвалюцыйнай барацьбы ня толькі за волю, але і за самае права беларускага народу на істнаваньне".

Гісторыя паўтараецца. Сучасны нацыянал-дэмакратычны рух на Беларусі, які пачынаў ад бязкрыўдных культурніцкіх аб'яднаньняў накшталт "Талакі" ці "Тутэйшых", няўхільна прывёў да БНФ "Адра-

джэнне", які імкнецца да вырашэння ня толькі культурных, але й палітычных задачаў.

З сяброў "Гуртка" нарадзілася першая беларуская нацыянальная партыя — Беларуская Рэвалюцыйная Грамада. Па азначэнньню Зьміцера Жылуновіча, БРГ была "Беларуская сацыялістычная партыя, што паставіла грунтоўна пытанне соцыяльна-нацыянальнага вызваленне беларускіх працоўных гушчаў".

Неўзабаве перайменаваная ў Беларускую Сацыялістычную Грамаду, партыя ў сваёй праграме апрача пунктаў пра беларускую мову, нацыянальную школу, вылучала патрабаваньні аб перадачы зямлі сялянам, фабрыкаў — рабочым, усталяваньні дэмакратычнага ладу і абвешчаньні аўтаноміі Беларусі. Нацыянальная барацьба ніколі не разглядалася БСГ асобна ад сацыяльнага вызваленне. Адзін з ідэолягаў БСГ, сябра ЦК партыі, Антон Луцкевіч, засьцерагаў прыхільнікаў чыстай культурніцкай працы: "Між працоўнікамі на глебі народнай пачалі аб'яўляцца людзі, для каторых національная справа не лучылася болей са справай дэмократызму. Сьляпые: яны бачаць толькі адзін бок жыцьця народу, іх слабые вочы за апраткай душы народнай — мовай — ня могуць дагледзіць самай душы. Яны, ганяючыся за чыста національнымі ідэаламі, не бачуць сьлёз і гора працоўнага народу, ня чуюць таго крыку, што рвецца з набалелых грудзей гаротніка: "хлеба!.."

БСГ была не адзінай партыяй у рэвалюцыйным руху на Беларусі ў пачатку XX стагодзьдзя. У гэты час у краі дзеялі СДПіЛ, СРы, ППС, РСДРП, Бунд ды інш. Але БСГ зьяўлялася адзінай партыяй на Беларусі, ідэалёгіяй якой грунтавалася на глебе беларускага нацыянальнага адраджэньня. Беларуская Сацыялістычная Грамада была адзінай партыяй, якая паўсюдна зьвярталася да беларуса на яго роднай мове, якая прадбачыла вялізныя перспэктывы духоўнага, культурнага разьвіцьця беларускай нацыі ды выконвала такім чынам у справе абуджэньня беларускага народа з нацыянальнага летаргу сапраўды гістарычную місыю.

Зьвернемся да сьведкі таго часу: "Агітацыя на роднай мове, чым карысталася Беларуская Сацыялістычная Грамада, мела агромнае значэньне для кідання соцыялістычных ды рэволюцыйных ідэй у сялянскія гушчы, даючы лёгкае іх усваеньне нават нясграмагнаму селяніну", — пісаў сацыял-дэмакрат З.Жылуновіч пра грамадаўцаў. Дарэчы, УЛенін, які вельмі скептычна ставіўся да ідэяў нацыянальнага адраджэньня і прытрымліваўся адкрыта пракасмапалітычных поглядаў (гэтая хвароба, выпешчаная ў РСДРП, затым з посьпехам перайшла ў ідэалёгію КПСС і яе вернага адзьдзелу — КПБ і ледзь не

забіла беларусаў як нацыю) мусіў прызнаваць, што на Украіне і Беларусі "Отечество" еще не спело всей своей исторической песни".

Грамада дзеяла ня толькі на вёсцы, а па магчымасці працавала і ў месце, сярод пралетарыяту ды рамесьніцтва. Як зазначае Вінцук Склубоўскі, арганізаваныя Грамадою прафсаюзы аб'ядноўвалі ў сваіх радох працоўных бяз розьніцы да іхняе нацыянальнасьці. Гэта спрыяла посьпеху партыі сярод працоўных і вызначала на будучыну гуманны, прагрэсіўны характар беларускага нацыянальнага руху, што адзначалі і прадстаўнікі іншых народаў. У 1912 годзе у польскім часопісе "Świat słowiański" характарызуючы беларускі нацыянальны рух, хтосьці В.Б. адзначаў, што рух гэты пазбаўлены безумоўнага нацыянальнага эгаізму, як, дапрыкладу літоўскі ці латыскі. Беларусы не навязваюць сваёй нацыянальнасьці іншым, але працуюць сярод свайго, да нядаўняга часу аморфнага народу.

Прынцып нацыянальнага раўнапраўя быў закладзены ў падмурак ідэалёгіі Грамады, ідэалёгіі ўсяго беларускага адраджэнчага руху, нягледзячы на тое, што беларусы знаходзіліся ці не ў самых неспрыяльных умовах для разьвіцьця ўласнай нацыянальнай ідэі. А. Луцкевіч у сваім праграмным артыкуле "Наш шлях" навучаў: "Не шкада сіл нашых, калі мы аддаём іх на тое, што ўзбагачывае нашу душу, павялічывае моц народу. Калі-ж яны ідуць адно толькі на разьвіцьце ў нас благога — ненавісьці, злосьці, завісьці і т.п., калі атдаюцца на змаганьне з другімі нацiямі, станамі, ці клясамі не дзеля вызваленьня, а толькі каб пакрыўдзіць слабейшага — тады шкада вытрачэных жыцьцёвых сіл, шкада, бо яны назад ня вернуцца і не ўзбагацяць нашэй культурнай скарбніцы.

Каб не марнаваць дарма сіл, каб не глуміць гэтага найдаражэйшага скарбу, лепшые людзі ўсіх націй стараюцца шырыць у сваім народзе думкі аб згадзі, аб тым, каб зьвясьці зусім національные сваркі і змагання. Асабліваю вагу гэткая работа мае ў нашым краю, дзе разам жывуць ажно пяць націй, дзе кожнай з іх трэба даць мейсца і простор для разьвіцьця — бяз крыўды да суседзеў. "Жыві сам і дай жыць другім" — гэтай думкай павінны кіравацца мы, беларусы, дабіваючыся правоў для сябе".

* * *

Самым непасрэдным чынам з разьвіцьцём беларускага руху, з дзейнасцю БСГ злучана імклівае разьвіцьцё беларускай літаратуры пачатку XX стагодзьдзя. Як бы і не навіна. Сувязі рэвалюцыйнага руху з беларускай літаратурай у нашых фундаментальных працах па гісторыі літаратуры быццам бы ніхто і не хаваў. Але з прычыны, што

сапраўднымі рэвалюцыянерамі доўгі час у нас лічыліся адно, бальшавікі, дык і ляўры ў рэнесансе беларускай літаратуры дзе нахабна, а дзе моўчкі, бы так і належыць, прыпісваліся ім, не зважаючы на тое, што абсалютовая іх большасць як да рэвалюцыі, так і пасьля не карысталася беларускаю моваю і не лічыла беларусаў за самастойную нацыю.

Паслугачамі ад літаратуразнаўства з партыйным квітком у кішэні была перакрэсьленая праўда. Паслухаем, што ж гавораць сумленныя даследчыкі. Зьліквідаваны ў 30-х гадох, вядомы ў свой час крытык і літаратуразнаўца У.Дзяржынскі пісаў: "Для кожнага, хто знаёмы з гісторыяй беларускага адраджэнскага руху і з гісторыяй нашаніўскае поэзіі, вядома, у якой шчыльнай, проста неразрыўнай сувязі знаходзілі яны паміж сабой. Агульныя тэндэнцыі, ідэалы і настроі першага, быць можа, найбольш яркага, поўна і праўдзіва выяўляліся іменная праз нашаніўскае мастацкае слова". І яшчэ: "Бясспрэчны факт, што нашаніўскі нацыянальны рух, выразіцелькай якога была і нашаніўская поэзія, зьяўляўся рухам ярка-рэволюцыйным у адносінах да старога рэжыму. Лёзунг гэтага руху — адраджэньне Беларусі нацыянальнае на грунце карэнных політычна-соцыяльных зьмен. Задачам гэтага адраджэньня ў першую чаргу і служыла нашаніўская поэзія..."

Аб тым, у якой ступені ідэалы нацыянальна-рэвалюцыйнага руху, які ачольвала Беларуская Сацыялістычная Грамада, знайшлі водгук у беларускай літаратуры пачатку XX стагодзьдзя, мы гаварыць ня будзем. Гэта тэма асобнай гутаркі. Для нас зараз істотныя сам факт ды паслядоўнасць гэтай прычыннай сувязі. Пакіньма на час нашыя тэарэтычныя развагі і зьвернемся да пісьменьнікаў-адраджэнцаў. Што ж падштурхнула іх да творчасьці? Што прымусіла ўзяцца за грандыёзную справу — стварэнне літаратуры Богам забытага народа? Чытаем успаміны, лісты і вымалёўваюцца асноўныя матывы.

Найперш — фальклёр, стыхія мілагучнай, вытанчанай і дасканалай беларускай мовы. Мовы, якая працінала сэрца і ўзбагачала розум, давала магчымасць казаць на ёй пра усё.

Карусь Каганец вёў фальклёрныя запісы, апрацоўваў народныя паданьні ды легенды. Падавалі ў сваім пераказе беларускія казкі Цётка і Якуб Колас, легенды і баляды — Алесь Гарун, Альбэрт Паўловіч.

Якуб Колас згадваў: "У нас часта начавалі розныя людзі, пераважна сяляне. Цэлымі вечарамі я слухаў іхнія апавяданьні, у якіх раскрываўся для мяне новы сьвет паняцьцяў і ўяўленьняў. Спасярод начлежнікаў трапляліся цудоўныя апавядальнікі, гаваруны, сатырыкі...".

Янка Купала гэтак адгукаўся пра ўплыў фальклору на ягоную асобу: "Ды больш за ўсё, я думаю, зрабілі ўплыў на мяне беларускія народныя казкі, якія я чуў у дзяцінстве... Вось жа хто, хіба, быў маім першым настаўнікам, хутчэй натхняльнікам па адносінах да маёй у далейшым паэтычнай творчасці".

Мяркуючы аб матывы, якія натхнялі да творчасці Максіма Багдановіча, ягоны бацька, Адам Багдановіч, пісаў: "І ўдома і ў цётак ён чуў аповяды пра родную мінуўшчыну, дзе выплывалі розныя асобы і падзеі, своеасаблівыя, загадкавыя, так не падобныя на ўсё, што вакол. Тут ён чуў і беларускую казку, і беларускую песьню з яе сумным прывабным напевам, поўным глыбокага невычэрпнага пачуцьдзя, тут чулася жывая беларуская прымаўка, трапныя "крылатыя" словы. Гэта, вядома, былі крупінкі, крохі, але ён чуйна іх падбіраў, хапаючы ў паветры."

Трэба пэўне сказаць, што "перахварэць" на фальклор пасьпявае кожны з творцаў, хто нечага варты ў нашай літаратуры. Ніякім сьпецкурсам не прымусіш разумець, адчуваць чароўнасьць нашае песьні, казкі, жывога беларускага слова. Думаецца, а ці не абавязковая гэта ўмова для фармаваньня паўнавартаснае асобы ў нашай літаратуры. Лічы, няма моўнага асяродку, дык ёсьць фальклёр!

Немалую ролю ў станаўленьні нацыянальнае сьвядомасьці беларускіх пісьменьнікаў адыгрываў прыгнечаны стан беларусаў. Меркаваньні пра лёс свайго народа, ягонае мейсца спасярод іншых нацыяў падводзілі, натуральна, да імкненьня быць ня горшымі ад іншых. Калі суседзі — палякі, расейцы, летувісы, украінцы, латышы — маюць нацыянальныя літаратуры, родныя для гэтых народаў, маюць сваіх пісьменнікаў, дык чаму ж беларусам ня мець сваіх песьняроў?

Гэй, русіне! Што так зажурыўся?
Чы пра Русь ты сваю шчэ не забыўся?

- задзірліва пытаўся яшчэ ў 1899 годзе Карусь Каганец. Янка Купала заўважаў, што яшчэ да пачатку сваёй творчасьці "адчуваў сацыяльную ды нацыянальную крыўду да беларускага працоўнага люду... Усё ж я ўсьведамляў, што кніжка на беларускай мове не горшая ад астатніх, а нават лепшая, таму што ў ёй вялася гаворка пра гора блізкіх мне людзей, з якімі разам фізычна працаваў". І яшчэ: "Якімі былі паэтычныя штуршкі? Усё, што акаляла: і сацыяльная і нацыянальная крыўда, і беларуская прырода, і песьні, пачутыя на полі, на вясельлі, на вечарынцы..."

У пошуках прычынаў, якія абуджалі беларусаў як нацыю, Максім Гарэцкі небезпадстаўна пытаўся: "Ці гэта законная зайздрасьць к другім мо' і драбнейшым, галінкам дрэва славянскаго,

што куды раней пукацца пачалі і к часу беларускага адраджэньня закрасавалі?"

Якуб Колас у тон ім зазначаў: "Мне здаецца, што такі забіты, бязьлікі стан народа, як беларускі народ, не можа ня выклікаць пратэсту і пачуцьця крыўды ў душы больш ці менш чуйнага яго прадстаўніка".

Фактычна пра гэта — абуджэньне нацыянальнага пачуцьця з прычыны сацыяльнае няроўнасці — напісаная раньняя паэмка Алеся Гаруна "Мае коляды".

Выразна адчуваў абдзеленасьць беларусаў Янка Купала, пішучы:

Кожны край мае тых, што апяваюць,
Чым ёсьць для народа ўпадак і хвала,
А беларусы нікога ж ня маюць,
Няхай жа хоць будзе Янка Купала.

Дарожнага з творцаў па-рознаму трапіла беларускае мастацкае слова. Менавіта яно часта рабілася штуршком да пачатку творчасьці.

Я.Купала адзначаў: "яшчэ да рэвалюцыі 1905 г. мне трапіліся кніжкі вершаў Марцінкевіча і Багушэвіча, і, наколькі памятаю, я імі надзвычай захапіўся".

М.Гарэцкі ў "Гісторыі беларускай літаратуры" гэтак піша пра А. Гаруна: "Пісаць па-беларуску Гарун пачаў з 1905 году, а беларускае друкаванае слова першы раз увідзеў у 1903 ці 1904 годзе, прыпадкова знайшоўшы абадраную, запэцканую, без пачатку і канца, цікавую кніжку, друкаваную лацінкай... Але з першых жа прачытаных слоў нязвычайна зьдзіўлены хлапец пачуў, як неўспадзеўкі закалацілася яго сэрца, на вачох, няма ведама чаго, накруціліся слёзы...". З.Жылуновіч удакладняе: "яшчэ з 1903 году (А.Гарун — А.Б.) зацягваецца "Гапонам" В.Марцінкевіча. Гэты твор на роднай мове кратае яго душу і выклікае пяшчотныя пазывы".

Я.Колас згадваў: "Першы беларускі твор, які я пачуў, быў верш Янкі Лучыны (Неслухоўскага) "Стары ляснік". Яно пакідала на мяне моцнае ўражанне не сваімі літаратурнымі вартасцямі, а тым, што яно было напісана па-беларуску. Параўнаўча нізкія літаратурныя вартасці яго мелі для мяне той добры бок, што надалі мне ўпэўненасьці самому напісаць штосьці падобнае, ня горш ад напісанага".

Апавядаючы пра Максіма Багдановіча, Адам Ягоравіч, ягоны бацька, зазначаў: "Ад казак ён перайшоў да песьняў, загадак, прымавак ды інш., цягнучы з маёй бібліятэкі кніжку за кніжкаю. І так дапяў да мастацкіх твораў Дуніна-Марцінкевіча, Бурачка ды інш".

Літаратурныя традыцыі, закладзеныя В.Дуніным-Марцінкевічам, Ф .Багушэвічам, моцна ўплывалі на пачаткоўцаў. Сьвежыя па

тым часе вершы Ф.Багушэвіча, Я.Лучыны, А.Гурыновіча, напісаныя пры канцы XIX стагодзьдзя, былі за ўзор, паказвалі на свой правідловы шлях разьвіцьця літаратуры. Ды за гонар быць першымі і В.Дунін-Марцінкевічу, і Ф.Багушэвічу, і Я.Лучыну давялося добра заплаціць. Нягледзячы на невялікае, у кожным канкрэтным выпадку, кола сяброў і знаёмых, што падтрымлівалі паэтычныя экзэрсісы пачынальнікаў, усё ж яны былі кожны паасобку. Не было нацыянальнага, і як вынік — літаратурнага руху, не было агульнай канцэпцыі беларускай ідэі, цяжка было разглядзець хоць нейкія пэрспэктывы. Якуб Колас, які пачынаў пісаць ужо пазьней, і той з прыкрасцю адзначаў: "Беларуская мова, здавалася, існавала толькі для таго, каб пацвеліцца над ёю, і пасьмяяцца... Нягледзячы на гэта я працягваў пісаць беларускія творы, а разам з тым усё больш і больш пераконваўся ў тым, што беларуская мова мае такое ж права на жыцьцё, на сваё разьвіцьцё, на свой ужытак у школе, у жыцьці беларуса, як і усякая іншая мова. Перспектывау на гэтае разьвіцьцё не было ніякіх, і я перажываў цяжкія хвіліны горкага ўсьведамленьня, што мае творы ня будуць мець хады і беларуская мова не будзе прызнанаю". Такое безвыходнае становішча непазьбежна абмяжоўвала кругагляд пісьменнікаў, што моцна адбівалася на іхняй творчасьці.

Кардынальна сітауцыя мяняецца на пачатку XX стагодзьдзя, у адзін час са стварэньнем першай рэальнай нацыянальнай сілы — Беларуская Сацыялістычнай Грамады. Праграма гэтай партыі была даволі шырокай і рэвалюцыянізаванай: на зьезьдзе ў канцы 1905 г. "у выніку гарачае дыскусіі выявілася, што эсэраўшчына мае дужа слабыя карані сярод грамадаўцаў, а пераважна кірунак с.-д. — пераважна ў пэпээсаўскай інтэрпрэтацыі ў адносінах да нацыянальнага пытаньня".

Удакладненьне А.Луцкевіча наконт "пэпээсаўскай інтэрпрэтацыі" паказвае на вялікае значэнне ў праграме БСГ нацыянальнага пытання ў адрозненні ад "истинных" эсдэкаў.

Грунтоўна і аб'ектыўна дзейнасьць БСГ, яе задачы і прынцыпы яшчэ не вывучаліся. Але самае істотнае і бясспрэчнае для нас тое, што менавіта ў гэтым асяродзьдзі выпрацоўвалася ідэалёгія нацыянальнага беларускага руху, абмяркоўваліся і практычна вырашаліся задачы па абуджэньні нацыянальнай свядомасці беларусаў. Захопленасьць і перакананасць у правідловасьці сваёй справы былі ў беларусаў-адраджэнцаў наздвычай вялікімі. Усячасны рух наперад смутнай і расплывістай, але крыштальна чыстай і гэтым захапляючай думкі нацыянальнага адраджэння беларусаў спаміж невялікага гурту беларусаў-ахвярнікаў, для якіх "справа беларуская станавіла бытцым інтэ-

гральную, неаддзялімую часьць іх душы", іхняя канкрэтная кіпучая праца якраз і спрыялі ўтварэньню атмасферы, якая ў сваю чаргу спрыяла разьвіцьцю беларускай літаратуры, і нават болей — літаратуры наступальнай ды аптымістычнай, што адбівала патрэбы гэтага руху, зьяўлялася ягонай складаемай часткаю. "Сельскі настаўнік, лясьнік, дробны чыноўнік, рамесьнік-рабочы, хлебароб-селянін пакіравалі ў Беларускую Сацыялістычную Грамаду, хапіўшыся за чытанне беларускай літаратуры, за агітацыю й пропаганду на беларускай мове" — гэтак апісваў той час Цішка Гартны. Зьявіліся няпэўныя пакуль, але такія заманлівыя пэрспэктывы разьвіцьця. "На працягу нядоўгага часу (канец 1905-1906 г.) — адзначае Цішка Гартны, — нарадзіўся шырокі слой свядомых нацыянальна беларусаў, якім патрабавалася мець організацыю, тварыць сваю нацыянальную культуру". І беларускія пісьменьнікі сьмела ўступілі на гэты шлях, выконваючы гістарычную місыю — узьнімаючы праз літаратуру праблемы нашага народу на агульначалавечы, сусветны ўзровень.

Можна праназіраць у якой ступені на беларускіх пісьменьнікай уплывала дзейнасьць Беларускай Сацыялістычнай Грамады.

У ранейшых літаратуразнаўчых працах гэтыя ўплывы не вызначаліся і не канкрэтызаваліся.

Цётка — Алёйзыя Кейрысава з Пашкевічаў была ля вытокаў беларускага нацыянальнага руху. Яна пачынала беларускую работу ў Вільні праз далучэньне да Беларускай Рэвалюцыйнай Грамады - (пазьней БСГ) Вацлавам Іваноўскім, студэнтам Пецярбургскай тэхналёгіі яшчэ ў 1903 годзе і адразу ж узяла актыўны ўдзел у працы партыі. Гэта адзначае С.Александровіч у прадмове да твораў Цёткі.

Пачатак яе літаратурнай творчасьці (першы датаваны верш Цёткі — "Мужыцкая доля", 1903 г. трэба меркаваць, трохі раней былі напісаныя вершы "Лета", "Восень") прыкладна супадае з далучэньнем яе да нацыянальна-рэвалюцыйнага руху. Публіцыстычныя вершаваныя творы Цёткі "Хрэст на свабоду", "Мора", "Пад штандарам" выкарыстоўваліся супраць самаўладства. Яны выдаваліся БСГ і, як згадвае А.Бурбіс, "дзесяткамі тысяч распаўсюджваліся, асабліва сярод віленскіх работнікаў". Гэтыя і яшчэ некаторыя вершы Цёткі можна ўважаць, на нашу думку, за партыйную паэтычную публіцыстыку.

Карусь Каганец, які пачынаў пісаць па-беларуску яшчэ ў канцы XIX ст., быў адным з заснавальнікаў Беларускай Сацыялістычнай Грамады. Пра гэта яшчэ ў машэраўскія часы ўдалося сказаць С.Александровічу: "К.Каганец прымаў актыўны ўдзел у беларускім нацыянальна-вызваленчым руху, быў членам Беларускай сацыялістычнай грамады, рабіў захады яшчэ ў 1904 годзе адносна выданьня ў Мінску

беларускай газеты "Палесьсе". Таму ў гады рэвалюцыі 1905-1907 гг. ён на самым пярэднім краі барацьбы з царызмам. За агітацыйную дзейнасць сярод сялянства Койданаўшчыны К.Каганец трапіў у сьнежні 1905 года ў Мінскую турму і прасядзеў там да мая 1906 года... У 1910 годзе Віленская судовая палата прыгаварыла К.Каганца за ўдзел у рэвалюцыі 1905 года за зьняволеньня ў Мінскай крэпасьці, дзе ён з 26 ліпеня 1910 года адсядзеў роўна год".

Творчасць К.Каганца займае ў беларускай літаратуры даволі сьціплае мейсца. Але на пачатку стагодзьдзя, яшчэ да выхаду "Нашай Долі", ягоныя нешматлікія творы на беларускай мове друкаваліся ў выданнях краю. Самое існаваньне сялянскага паэта-агітатара, які пасьлядоўна выступаў у абарону нацыянальнай самабытнасці беларусаў (гл. ягоныя публіцыстычныя зацемкі "Парады" ды "З рэфэрату на Калядны сход беларускай грамады 1903 года", адыграла пэўную ролю ў стварэньні перадгромавай атмасфэры.

Варта адзначыць раньняе знаёмства Каруся Каганцаа з братамі Луцкевічамі, тады яшчэ менскімі гімназістамі, гэтымі нястомнымі рухавікамі надыходзячага нацыянальнага адраджэння.

Цікавае пытанне і пра тое, ці былі якія ўплывы К. Каганца на Цётку. Абодва працавалі ў аднэй партыі, пэўне ж, не адзін раз сустракаліся, абодва пісалі вершы, у тым ліку і для прапагандысцкіх мэтаў, абодва мэтанакіравана працавалі над выхаваннем нацыянальнай сьведамасьці беларускіх дзетак: Цётка напісала ў 1906 г. "Першае чытанне для дзетак-беларусаў", тады ж убачыў сьвет і "Беларускі лемантар" К.Каганца. Нажаль, ніякіх зьвестак не захавалася, і можна толькі меркаваць пра тыпалягічнае падабенства іхняе творчасці. З.Жылуновіч трапна заўважыў: "К.Каганец і Цётка (А.Пашкевіч) ужо даюць нам песьняроў соцыялістычнага адбітку. Бадай што яны фактычна ёсць першыя закладальнікі тае грунтоўнае ў беларускім нацыянальна-культурным руху асярэдзіны дзеячоў, якія пранясьлі на сабе ўсю цяжар часоў замацаваньня ды аформленьня беларускае справы. І Карусь Каганец і Цётка зьвянчалі ў сваёй чыннасці ліру поэты з мячом барацьбіта рэволюцыанэра гэтым пераняўшы спадчыну К.Каліноўскага".

З аўтабіяграфічных успамінаў Я.Купалы мы даведваемся, што наздвычай важную ролю ў станаўленні нацыянальнае самасьвядомасьці паэты, у рашэньні пісаць па-беларуску, аказала рэвалюцыйна-агітацыйная літаратура на беларускай мове, якую ў той час выдавала толькі БСГ: "Ды вось трапляюцца мне ў 1904 г. ці на пачатку 1905 г. рэвалюцыйныя гіраклямацыі на беларускай мове і кніжкі "Дудка беларуская" Багушэвіча і "Гапон" ці нейкая іншая кніжка Марцінкевіча,

выданая за мяжою, і ўсё маё польскае пісаньне пайшло ў бок. З гэтага часу я пачытаю пісаць толькі па-беларуску". І далей: "У 1904 г. трапляюцца мне ў рукі беларускія праклямацыі і рэвалюцыйныя брашуры на беларускай мове. Гэта канчаткова вырашыла, што я беларус і што адзінае маё пакліканне — служыць сваему народу ўсемі сіламі сваёй душы і сэрца".

Цікава, што пра гэтыя першаштуршкі не заўсёды мелі ўяўленьне нават тыя, хто засяваў край беларускімі улёткамі ды праклямацыямі. Антон Луцкевіч у 1918 годзе ў крытычным артыкуле пра Купалу зазначаў: "Пачаў пісаць Купала перад Рэволюцыей 1905 году, калі рух беларускі толькі-толькі пачынаўся, укрываючыся ад вострых вачэй расейскіх жандароў, калі ешчэ ў поўнай меры трывала забарона беларускага друку. Можна з поўнай пэўнасьцю сказаць, што пачатак творчасці Купалы — зусім самабытны, не зьвязаны з гэтым рухам". Як мы бачым, гэтае ягонае сьцьвярджэньне не зусім адпавядае таму, пра што пісаў ва ўспамінах сам Купала.

Значны ўплыў на Купалу як паэта, на вызначэнне шляхоў разьвіцьця ягонай творчасьці і напачатку, і пазьней, у Вільні, аказала асабістае знаёмства паэта з беларускімі рэвалюцыйнымі дзеячамі, сябрамі Беларускай Сацыялістычнай Грамады. Згадаем некалькі сціслых, але выразных заўвагаў Купалы з гэтае прычыны: "Дарэчы, павінен зазначыць, што я пазнаёміўся з беларускімі рэвалюцыйнымі дзеячамі... калі жыў яшчэ ў Бараўцах (у 1904 г. — А.Б.). Я ўжо тады пісаў і свае вершы паказваў У.І.Самойлу, на працягу 2-3 гадоў і перапісваючыся з ім. Ён заўсёды хваліў і заахвочваў мяне да пісаньня. Пры ягоным судзеяньні быў надрукаваны па-беларуску мой першы верш "Мужык". Яшчэ: "У 1904-1905 гг. я пазнаёміўся з беларускімі рэвалюцыйнымі дзеячамі (здаецца сябрамі "Грамады") У.І.Самойлам, былым маім рэпетытарам, Бурбісам, у далейшым камісарам земляробства БССР... Яны давалі мне нелегальную літаратуру для распаўсюджваньня і т.п." "Якія сустрэчы паўплывалі на мяне ў літаратурных адносінах? — Цяжка сказаць. У перыяд знаёмства з панам Чаховічам я тады не пісаў яшчэ. Застаецца з таго часу Ядвігін Ш. і У.І.Самойла. Абодва яны людзі сур'ёзныя, культурныя і самі літаратары, супрацоўнічалі ў газэтах і, безумоўна, усяляк заахвочвалі мяне ў маім пісаньні". "Сустрэча з людзьмі? Цяжка сказаць, хто і які ўплыў аказаў на мяне... акрамя Чаховіча, які быў высокакультурны чалавек, але паляк, я ў той час пазнаёміўся з Ядвігіным Ш. (А.Лявіцкім). Гэта таксама быў чалавек культурны, выключаны з універсітэту за рэвалюцыйную дзейнасьць, да ўсяго ён аказаўся беларусам,

пісаў па-беларуску... З ім мы доўгія гадзіны гутарылі пра беларускую літаратуру ў прыватнасці і пра беларускае пытанне ўвогуле".

Усе вышэйзгаданыя асобы — У.І.Самойла, і Ядвігін Ш., і А.Бурбіс — былі актыўныя бэсэгоўны. А.Бурбіс нават сябрам ЦК партыі.

Уяўляюць цікавасьць для нас і радкі ўспамінаў пра Я.Купалу Антона Луцкевіча, гэтаксама сябра ЦК БСГ: "На тую-ж тэму (пісаць па-беларуску — А.Б.) гутарыў з ім і аўтар гэтых радкоў, калі ў 1905 годзе давялося яму першы раз спаткацца з гэтым скромным, вельмі нясмелым і напэўным сябе дзецюком у Менску".

Пра сацыяльна-палітычныя пагляды Я.Купалы, якія адбіваліся на ягонай творчасьці, гавораць і факты ўдзелу паэта ў рэвалюцыйным руху. Сам паэта чамусьці зьмяншаў сваю ролю ў гэтых падзеях. У лісьце да Л.Клейнбарта ён пісаў: "У нацыянальным беларускім руху, калі можна так сказаць, чыннага ўдзелу не прыймаў, акрамя рэдактарства ў "Нашай Ніве", у гэтым руху, якім кіравалі браты Луцкевічы, была, безумоўна, і палітыка, а дзе была палітыка, я імкнуўся ў яе не ўблытвацца".

Неадпаведнасць паміж гэтымі радкамі і рэчаіснасцю адзначаў у сваёй кнізе "Беларускі літаратурна-грамадскі рух у Пецярбурзе" яшчэ Р.Семашкевіч: "Прызнанне Купалы гучыць трохі парадаксальна. Уся паэзія яго — палітыка, спалучаная з высокай грамадзянскасцю, уся паэзія — выкрыйце палітыкі царызму". Акрамя згаданых намі ўжо радкоў Купалы, прыцягвае ўвагу таксама эпізод, апісаны ва ўспамінах П.Бычкоўскага, выдрукаваных у кнізе "Успаміны пра Я.Купалу". Янка Купала прысутнічаў на нелегальнай сходцы, якая праходзіла ў хаце Пятра Бычкоўская ў канцы траўня 1906 года. Нечакана зьявілася паліцыя. Купала уцёк, а Бычкоўскі Антон, ягоныя браты Ян і Ясь, К.Казлоўскі і А.Шпакоўскі былі арыштаваныя, абвінавачаныя ў арганізацыі маёўкі, падбухторваньні сялян да закалоту і пасаджаныя ў астрог, адкуль былі выпушчаныя толькі праз два месяцы пад залог.

Як нам бачыцца, нежаданьне Купалы раскрываць свой удзел у рэвалюцыйна-дэмакратычным руху, у "палітыцы" тлумачыцца, адно, часам напісання ліста да Л.Клейнбарта — лютым 1929 года. Ужо грымела барацьба з нацдэмамі. Удзел у дарэвалюцыйнай працы любой партыі, акрамя сацыял-дэмакратычнай (бальшавікоў) быў ужо доказам супраць чалавека. Менавіта таму Купала заяўляў пра свой палітычны нэйтралітэт.

Такім чынам, мусім канстатаваць: непасрэдная роля Я. Купалы ў рэвалюцыйна-дэмакратычным руху магчыма і не была вялікай, ды яна, пэўне, была і зьяўляецца выразным паказальнікам ягоных грамадзка-палітычных настрояў, перакананняў.

Дзякуючы грунтоўным анкетам Л.М.Клейнбарта мы гэтаксама можам праназіраць за ўдзелам у рэвалюцыйным руху Якуба Коласа. Паэта пісаў: "Хваля рэвалюцыі ў 1905 годзе захапіла мяне. Я далучыўся да рэвалюцыйнага руху разам са сваімі сябрамі, сельскімі настаўнікамі".

Антон Луцкевіч адзначаў: "Улетку 1906 году ў Вільні адбыўся — з учасьцем Якуба Коласа і іншых — скліканы намі зьезд народных вучыцялёў, які і пастанавіў закласьці тайны саюз беларускіх настаўнікаў, галоўнай мэтай якога была барацьба за беларусізацыю народных школаў у Беларусі".

Трохі пазьней, у ліпені 1906 г. адбыўся зьезд беларускіх настаўнікаў у вёсцы Мікалаеўшчына, на радзіме Я. Коласа, разагнаны паліцыяй. За ўдзел ў зьезьдзе, як адзін з арганізатараў, Я.Колас дастаў тры гады астрогу. На зьезьдзе былі абмеркаваныя праблемы становішча настаўнікаў, іхняя роля ў грамадзкім жыцьці і ў рэвалюцыйным руху. Была прынята пастанова пра ўтварэньне саюза настаўнікаў Беларусі. Адгукаючыся аб палітычныя настроі сярод удзельнікаў зьезда, Я.Колас адзначаў: "Трэба было перадумаць і сьвядома ўспрыняць арыентацыю той ці іншай партыі, а покі што ішло хістаньне між партыямі эсэраў і эсдэкаў. Значная большасць схілялася ў бок эсэраў".

Пра палітычныя погляды Я.Коласа ў астрожных успамінах згадвае стары рэвалюцыйны дзеяч А .Бонч-Асмалоўскі: "З партыі соцыялістых-рэволюцыянэраў яшчэ сядзелі ў турме наступныя таварышы... Міцкевіч — настаўнік, беларускі поэта, псэўдонім — Якуб Колас".

Палітычныя перакананьні Якуба Коласа не былі артадаксальнымі. Гутарка можа ісьці хутчэй пра агульную пляцформу. Эвалюцыя поглядаў паэты надалей адбывалася дзякуючы моцнаму ўплыву БСГ. Праграмы партыяў, асабліва па зямельным пытанні, шмат у чым былі падобнымі. Варта адзначыць, што ў 1917 годзе Я.Колас быў вылучаны наноў паўсталай БСГ на выбарах кандыдатам па сьпісе нум. 13 (БСГ).

Першая сустрэча Я.Коласа з Атласавым, які быў, па словах А.Бурбіса, адным з "найбольш энэргічных працаўнікоў Б.Р.Г. (БСГ — з 1903 г. — А.Б.) "пакінула на яго вялікае ўражанне, натхніла і дала магутны імпульс для творчасьці на роднай мове. Я.Колас гэтак апісвае іхнюю сустрэчу: "Восенню 1906 года на адным рэвалюцыйным зьезьдзе у г.Менску (трэба адзначыць, што гэты сход адбываўся ўжо пасьля няўдалага настаўніцкага сходу ў Мікалаеўшчыне, дзе хэньць да падобных рэвалюцыйных сходаў у Я.Коласа не адбілі. — А.Б.) я пазнаёміўся з Аляксандрам Мікітавічам Уласавым. Да таго часу ў Вільні зарадзілася група асобаў, якія пастанавілі выдаваць газэту на

беларускай мове. Уласаў неяк даведаўся пра мяне як пра беларускага паэта і прыехаў, каб знайсці мяне... Па вяртаньні да дому я прыняўся з палам за вершы... Выхад у сьвет беларускай газэты было найвялікшай падзеяй у маім жыцьці. Я ўвесь аддаўся беларускай паэзіі, стаў шчырым прапагандыстам беларускага адраджэння".

Можна меркаваць, што былі абгаворaны і праект выпуска "Нашай Долі", мэты і задачы газэты, накірунак матэрыялаў.

Беларускі гісторык В.Склубоўскі даводзіць, што "Наша Ніва" была органам Грамады, адначасова цэнтрам культурнага жыцьця ўсіх беларускіх прагрэсіўных сіл".

У яшчэ большай ступені партыйнасць выявілася ў першай беларускай газэце "Нашай Долі", пытанне пра выпуск якой абмяркоўвалася на партыйнай канфэрэнцыі БСГ і было падтрыманае аднагалосна.

Алесь Гарун 17-гадовым пачаў рэвалюцыйную дзейнасьць. Маладосці характэрны максімалізм. Вось жа і ён быў, па словах А.Барычэўскага, "актыўны ўдзельнік арганізацыі социялістых-рэволюцыянэраў максімалістах" (эсэраў — А.Б.). А.Зіміёнка (пісьменьнік А.Дзяркач), актыўны ўдзельнік падзеяў рэвалюцыі 1905 года на Беларусі, удакладняў: "У склад комітэту (эсэраў — А.Б.) ўваходзілі вядомыя й шчырыя рэволюцыянэры, як ... Аляксандр Прушынскі (потым беларускі поэта Алесь Гарун)". З.Жылуновіч адзначаў прамую сувязь Алеся Гаруна з Беларускай Сацыялістычнай Грамадой, мянуючы яго "сябрам Беларускай Сацыялістычнай Грамады з максымаліцкім ухілам". Прыймаючы актыўны ўдзел у дзейнасьці эсэраў, Алесь Гарун, трэба меркаваць, супрацоўнічаў і з Менскім камітэтам БСГ. Падыход да нацыянальнага пытання ў дзейнасьці гэтай партыі ня мог не прыцягваць яго. Ужо у 1905 годзе паэта, як зазначае А.Барычэўскі, дэклямаваў свае беларускія агітацыйныя вершы па вёсках.

У часы спаду рэвалюцыі, у 1908 годзе пачалі свой літаратурны шлях Максім Багдановіч, Цішка Гартны, Зьмітрок Бядуля. Да іх ідэі беларускага нацыянальнага адраджэньня прыйшлі праз "Нашу Ніву", рэдакцыя якой, па словах Антона Луцкевіча, "зьяўлялася фактычным цэнтрам ня толькі Грамады, якая фармальна як-быццам замірае, але і ўсяго беларускага адраджэнскага руху — яго "генэральным штабам".

Падзеі 1905-07 гадоў закранулі Максіма Багдановіча і Цішку Гартнага. Яшчэ ў малодшых клясах гымназіі М.Багдановіч прыймаў удзел у вучнёўскіх хваляваньнях. Ён захапляўся поглядамі анархістах, выступаў на гымназічных зборах і нават удзельнічаў у падрыхтоўцы ўзрыва самаробнай бомбы у мурох гімназіі.

Трэба ўсьведамляць, што гэтыя яшчэ як бы і несур'ёзныя захапленьні атрымалі лягічны працяг у адраджэнчай дзейнасьці

М.Багдановіча — паэта і публіцыста. Стасункі з беларускім адраджэньнем у М.Багдановіча мелі болей культурны чымся палітычны характар. Зусім зразумела. Паэта жыў далёка ад Беларусі, ад тых падзеяў, што захапілі яе. Мабыць таму публіцыстычныя вершы займаюць невялікае мейсца ў ягонай творчасці. Больш упэўнена М.Багдановіч выкарыстоўваў літаратурныя, міфалягічныя, агульначалавечыя сюжэты. Праца над формаю, удасканаленьне паэтычнага майстэрства, эстэтыкі твораў — натуральнае выйсце ў становішчы, так бы мовіць, пражывання па-за падзеямі. Падобнае адбывалася і з іншымі буйнымі паэтамі — Уладзімерам Жылкам, які жыў у Празе, ці Натальляй Арсенневай, якая мусіла жыць у этнічнай Польшчы.

Пад час прыезду М.Багдановіча на Беларусь ён адразу ж падключаецца да актыўнага грамадзкага жыцьця. Дастаткова згадаць, што найбольш яркія публіцыстычныя творы, у тым ліку і сваю славутую "Пагоню", М.Багдановіч напісаў у Менску у 1916-17 гадох, калі ён "стараўся быць на ўсіх пасяджэньнях, сходках, дзе прымаў усягды чынны ўдзел".

Неабходна згадаць, што з першых нумароў "Нашай Долі" і "Нашай Нівы" М.Багдановіч чытаў іх, быў асабіста знаёмы з рэдакцыяй "Нашай Нівы", кіраўнікамі беларускага адраджэнчага руху. Паэта перапісваўся з А.Луцкевічам, В.Ластоўскім, актыўна друкаваўся ў "Нашай Ніве", гэтым ужо выказваючы сваю падтрымку яе грамадоўскага накірунку. Ён быў цалкам захоплены ідэяй беларускага нацыянальнага адраджэння: "быў поўны бадзёрасьці і веры ў сьветлую будучыню свайго народа... Трэба было яго бачыць у спрэчцы па нацыянальнаму пытанню — пытанню для яго усёпаглынаючай надзвычайнай важнасці".

Ц.Гартны гэтак апісвае сваё станаўленьне як рэвалюцыйнага і нацыянальна сьведамага беларускага паэты: "З 1904 г. Цішка Гартны прылучаецца да соцыял-дэмакратаў і становіцца актыўным рэвалюцыянэрам... Працуючы за сталом у смуродных майстэрнях, Цішка Гартны спачатку піша першы парасійску, чытаючы іх таварышам і адсылаючы ў расійскія часопісы. У 1908 годзе ён натрапляе на "Нашу Ніву", чытае вершы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Цёткі і захапляецца іх прыгажосцю і роднасьцю, ды пачынае пісаць сам пабеларуску".

Упершыню З.Жылуновіч пазнаёміўся з беларускім друкаваным словам, чытаючы улёткі і праклямацыі Беларускай Сацыялістычнай Грамады, якія моцна паўплывалі на ягоную нацыянальную свядомасць. Ён згадвае: "Восенню 1905 года ў Капыль трапілі нелегальныя брашуры і лістоўкі сацыялістычнай грамады. Я памятаю, што, угледзеўшы іх, я прагна і з захапленьнем чытаў іх на сходзе капылян у

хаце майго суседа Петруся Гамзы. Яснасьць сэнсу дзякуючы даступнасці і зразумеласьці мовы вельмі кранула мяне".

Надзвычай выразна сацыяльнае становішча Цішкі Гартнага, ягоныя палітычныя пагляды адбіліся ў паэтычнай творчасьці, якая па тэматыцы і ідэалёгіі адрозьніваецца ад паэзіі Я.Купалы ды Я.Коласа. Ц.Гартны быў першым беларускім пралетарскім паэтам, які адбіваў у сваіх вершах жыцьцё рабочага клясу. Антон Луцкевіч, ацэньваючы дарэвалюцыйную творчасьць Цішкі Гартнага, адзначаў: "Цішка Гартны — перш за ўсё пролетарый, свядомы сваіх клясовых інтэрэсаў і гатовы аддаць усе сілы свае за вызваленне працы ад панаваньня капіталу".

Ды ідэйныя і тэматычныя адрозьненьні ў творчасьці беларускіх песьняроў ніколі не зьяўляліся антаганістычнымі. Сам Ц.Гартны вельмі высока ацэньваў працу сваіх братоў па пяру. Ён разважае: "Літаратурная праца Цішкі Гартнага ўвесь час пераплятаецца з яго грамадзянска-палітычнай і рэволюцыйнай чыннасцю... Але ўжо гэткі лёс выпаў у жыцьці большасці беларускіх поэтаў і пісьменнікаў нашаніўцаў: на іх плечы гісторыя ўзлажыла цяжкую ношу — працу па адраджэнню свае прыгнечанае, цёмнае краіны. Выпаўняючы гэта заданьне, трэба было ім раскідаць свае сілы па розных баках, ужываць іх у розных галінах нацыянальна-грамадзянскага жыцьця, трэба было рабіць гісторыю. Праўда, беларускія песьняры-змаганьнікі цьвёрда і ўверана, самазабыўна аддаваліся гэтай вялікай справе і несьлі яе рашуча ўперад, бо кожны з іх жыў для гэтага".

Шчыльнае супрацоўніцтва Зьмітрака Бядулі з "Нашаю Ніваю", праца ў газэце, сяброўства з лепшымі прадстаўнікамі беларускае інтэлігенцыі, адбіваліся на творчасьці паэта ўзмацненьнем публіцыстычных матываў, паступовым выхадам на асэнсаванне агульна-нацыянальных праблем.

* * *

Замілаваньне да роднае мовы, захапленьне фальклорам, літаратура, створаная папярэднікамі — усе гэтыя факты паслужылі падвалінамі для адраджэння беларускае літаратуры. У той час як дзейнасьць Беларускай Сацыялістычнай Грамады, першай беларускай нацыянальнай партыі, была своеасаблівым дэтанатарам, які абумовіў гэты ўзрыў, надаў беларускім пісьменьнікам веры і ўпэўненасьці ў тым, што іхняя праца ня згіне дарма.

Для некаторых беларускіх творцаў (Цётка, К.Каганец, Ядвігін Ш.), дзейнасьць БСГ была крэўнай справаю. Для некаторых (Я.Купала,

Я.Колас, А.Гарун) уплыў партыі быў больш ускосным, але, мяркуючы па выказаных намі фактах, выразна акрэсленым.

Яе агітацыйная і прапагандысцкая праца, якая засноўвалася на нацыянальнай спэцыфіцы краю — улёткі, брашуркі, легальны друк, была рэактывам у справе абуджэньня нацыянальнае сьведамасьці беларусаў, была тым непрыкметным тлом для надзвычай высокага пафаснага публіцыстычнага ўзроўню беларускай паэзіі пачатку нашага стагодзьдзя. Можна лічыць, што тагачасная беларуская літаратура падпарадкоўвалася прынцыпам партыйнай літаратуры — вольнай ад ліхвярства і залежнай ад разьвіцьця беларускага нацыянальнага і сацыяльнага руху. Гэта адзначае і У.Конан: "Нават у 1905-17 гг. беларуская літаратура, якая дасягнула вялікіх мастацкіх вышыняў, не была "чыстым" мастацтвам, якое б мела на першым пляне задачу — задаволіць спецыфічныя эстэтычныя патрэбы. Наадварот, яна была перш за ўсё сродкам нацыянальнага адраджэньня беларускага народа, мастацкая творчасьць адначасна была дзейнасьцю палітычнай, грамадзкай, навуковай, асветніцкай, інакш кажучы, дзейнасьцю "утылітарнай".

Ідэалёгія Беларускай Сацыялістычнай Грамады, нацыянальныя і палітычныя задачы, якія ставілі перад беларускім адраджэньнем ягоныя лідэры, адбіліся ў творчасьці нашаніўцаў. У сваю чаргу іхняя творчасьць адыграла вялікую ролю ў справе адраджэння беларускага народа, у барацьбе за сацыяльную справядлівасьць і нацыянальную незалежнасьць.

Для таго, каб нашыя развагі пра ўплыў і духовую сувязь паміж працаю Беларускай Сацыялістычнай Грамадою і творчасцю беларускіх пісьменьнікаў не падаліся бяздоказнымі, мы дэталёва спынімся на адной з праблемаў, якую спрабавалі асэнсаваць і вырашыць БСГ і беларускія пісьменнікі.

Спынімся наўмысна на праблеме сацыяльнага характару, погляд на якую можа быць даволі розным, бо калі пытанні адраджэньня і самавызначэння маюць больш унівэрсальны характар для прадстаўнікоў аднае нацыі, дык сацыяльныя праблемы больш разьядноўваюць чымся лучаць грамадзтва. Зямельнае ж пытанне было адным з найбольш вострых на Беларусі.

Усе бяз вынятку сацыялістычныя і сацыял-дэмакратычныя партыі надавалі яму вялікую ўвагу, але шляхі вырашэння бачылі рознымі. Што меркавала на гэты конт Беларуская Сацыялістычная Грамада? У праграме БСГ, якая выходзіла ў 1905 годзе асобнаю улёткаю, адзначаецца: "Па пытанню аграрнаму: мы будзем імкнуцца да зьнішчэньня права прыватнай зямельнай уласнасьці, пакідаючы

кожнаму права індывідуальнага працоўнага карыстання без эксплуатацыі наёмнай рабочай сілы і распаўасаджваючы адначасна для пераходу да сацыялістычнага ладу ідэю ўсебаковай каапераці і".

У адозвах БСГ мы знаходзім удакладненьне сітуацыі, якая склалася ў зямельным пытанні Беларусі, і шляхі яе вырашэньня. У звароце "Да усих работникау..." размова ідзе аб несправядлівы падзел зямлі. Мы чытаем: "Па справядлівасьці, то зямля — ніхто яе сам не зрабіў, і дзеля таго яна павінна належаць да усяго народа, да ўсёй нацыі, усе, што працуюць на зямлі сваімі рукамі, павінны з ёй самі карыстаць".

У гэтым самым звароце разглядаецца механізм эксплуатацыі сялянства: "Усё багацьце бярэцца толькі з працы людзкой. Вы, мужыкі, усе цяжка працуеце, усе абліваеце зямлю сваім потам, каб толькі пражыць, а памешчыкі, царскія чыноўнікі і другія дармаеды нічога ня робяць і жывуць з вашай крывавай працы".

У іншай улётцы, якая выйшла з нагоды першага сялянскага зьезду, фіксуецца асноўны, на думку бэсэгоўцаў, пункт грамадзкіх супярэчнасцяў: "Пакуль зямля будзе да казны, да цара і да паноў належаць, так шчасьця на сьвеце мужыку й усякаму працуюшчаму чалавеку ня будзе", а таксама прапануецца вырашэнне гэтага найважнейшага для сялянства пытання шляхам канфіскацыі зямлі бяз выкупу: "Трэба ўсю зямлю адабраць ад цара, ад казны, ды паноў, трэба, значыцца, дастаць зямлю сілай".

А як жа разумелі гэтае пытанне беларускія паэты? Яшчэ ў беларускім народным рэвалюцыйным гімне "Адвеку мы спалі" былі адзначаныя асноўныя задачы, якія стаялі перад народам:

Адвеку мы спалі і нас разбудзілі,
Мы зналі, што трэба рабіць:
Што трэба свабоды, зямлі чалавеку,
Што трэба зладзеяў пабіць.

Разам з воляю чалавека ў грамадзтве, сацыяльнай справядлівасьцю, валоданьне зямлёю забясьпечвала незалежнае, годнае існаваньне беларуса-працаўніка. Літаральна тыя ж словы, якія фармулююць сутнасць жаданых зьменаў, мы знаходзім у Янкі Купалы:

Жый згодна з усімі
І Бога хвалі,
Не крычы з другімі:
"Свабоды! Зямлі!"

Ці:

Хто ты гэткі?
— Свой, тутэйшы.

Чаго хочаш?
— Долі лепшай.
Якой долі?
— Хлеба, солі.
А што болей?
— Зямлі, волі.

Варта згадаць, што ў 60-я гады пад назовам "Зямля і воля" існавала рэвалюцыйная арганізацыя, якая, дарэчы, падтрымлівала паўстаньне 1863 г., у праграме якой вылучалася патрабаваньне: "Замацаванне за сялянамі ўсёй карыстанай імі зямлі... вызваленне народа ад чынавенства і ўладкаваньня сапраўды сялянскага самакіравання" (Вялікая Савецкая энцыкляпэдыя).

Гэтыя ж ідэі былі закладзеныя ў падмурак дзейнасці сацыялістычных партыяў на Беларусі на пачатку XX ст. Таму лёзунг: "Свабод! Зямлі!" па-сутнасьці быў кодам, за якім хавалася цэлая праграма рэвалюцыйных зьменаў.

Для таго, каб жыць, патрэбная зямля, і ў марах беларускага селяніна пра шчасьце ў Купалы мы чытаем:

Ад сьвету, ад Бога
Жадаю нямнога:
Зямелькі з валоку,
К ёй шнур неўдалёку.

Барацьба ў сьвеце ідзе, мяркуе Купала, для таго:

...Каб бедным і галодным
Дзянькі сыцейшы зацьвілі,
Зрабіць нявольніка свабодным,
Даць беззямельнаму зямлі.

Пра тое ж піша Я.Колас, які жадае беларусам на Новы Год:

Каб пабольшала нам поля,
Каб разросься вузкі луг...

Якое яно, сялянскае шчасьце? Колас перадае ўяўленьні пра яго праз сон мужыка ў астрозе:

Поле сонцам скрозь заліта, —
Шырыня, раўніна!
Глеба тлуста, сакавіта —
Чарназём ды гліна.
Не дакінеш проста вокам
Да суседскіх межаў...

... Ды рэальнасьць была іншаю:

Колькі поля, колькі
Ў тых, каму ня трэба!

А ў нас гэтак мала,
Што няма і хлеба. (Купала).

Купала адкрыта абвяшчае пра несправядлівасьць існуючага парадку, выступае супраць эксплуатацыі сялянства панамі:

Даўней мы знаці
Мусілі пана,
Каб карыстацца
З нівы ўспаханай.
Цяпер жа ў двор сіл
Цягнеш астаткі,
Каб зарабіці
На ўсе падаткі.

Паэта крытыкуе сістэму падаткаў, цяжар якой у першую чаргу лёг на мужыцкія плечы:

Няхай зьнімуць з цябе
Чынш, падаткі, налог,
Бо бясплатна для нас

Даў зямлю гэту Бог! Абмалёўваючы механізм эксплуатацыі мужыка панамі ды дзяржаваю, паэта ўжывае зразумелы для селяніна аргумэнт:

Калі часам дзе двузлотку
Зрабіў ты ў пана дзе,
Дык на чынш і на падаткі
Яе воласьць забярэ.

Хоць нам гэту зямлю-матку
Бог бясплатна дараваў
І плаціць чыншоў, падаткаў
За яе нам не казаў, —

Дый на гэта тут ня помняць
І, як могуць, так дзяруць,
Апасьледнюю кароўку
За падаткі прададуць.

Згадаем, што патрабаваньне пераразьмеркаваньня падаткаў, зьмяншэньня іх для сялянства было адным з патрабаванняў БСГ: "Усякі ведае, што мужыку цяжка жыць на сьвеце. З мужыкоў цар дзярэ падаткаў болей, як з усіх: паны плацяць 236 міліёнаў рублёў у год, а мужыкі — 700 міліёнаў, значыць у тры разы болей; зямлі ж у цара і ў паноў у два разы болей, як у мужыкоў. І цар, і паны, і чыноўнікі — усе жывуць з цяжкой мужыцкай працы".

"Ня плоцім падаткаў усе разам", — заклікала Грамада. Таму зусім натуральным гучаў заклік паэтаў-адраджэнцаў пра перадзел зямлі. Гэты ж заклік гучаў і ў праклямацыях БСГ. Цётка пагражае:

Нам зямлю, паны, аддайце.
Пагаворым, паталкуем,
Так разьдзелім, як зьмяркуем,
Каб ні многа і ні мала,
Каб зямля матуляй стала
Для усіх, каго зрадзіла,
Каб больш паноў не тварыла.

Яна ўпэўненая, што перадзел зямлі прывядзе да агульнай роўнасьці і шчасьця.

Я.Купала перакладае М.Канапніцкую і разам з ёю сьцьвярджае, што толькі той мае права на зямлю, "каму ў полі труд — закон, А чужыя з нівы вон!"

Але паэты-адраджэнцы добра адчувалі сітуацыю ў краі і ня мелі ілюзыяў на бесканфліктнае яе вырашэньне. БСГ вучыла мужыкоў: "Калі ні купіць зямлі ні можна, калі ні цар ні паны самі яе мужыкам не дадуць, то трэба значыцца дастаць зямлю сілай". Пра тое ж піша і Я.Купала:

Не чакай ты ласкі братняй,
Што можа калі
Дабравольна і бясплатна
Дастанеш зямлі...
Павер сіле, толькі сілай
Збудзесься ўсіх мук!

Яшчэ больш радыкальна выступае Якуб Колас:

— Што, брат Грышка, папраўляйся:
Чутка ёсьць — зямлі дадуць.
Не хварэй, брат, падымайся
Ды ачуньвай як-нібудзь.

— Эх, Мікола, што тут цешыць?
І стары, а як дзіця:
Не, ня будзе нам жыцьця,
Як паноў не перавешаць.

Ідэі сацыяльнай справядлівасьці, будучага ўладкавання сьвету ў беларускіх паэтаў не былі дакладнай копіяй тэарэтычных распрацовак БСГ. Паэты сыходзілі найперш з патрэбаў беларускага сялянства, улічвалі і ягоную псыхалёгію і тыя формы землекарыстання, якія склаліся на. Беларусі. У нас адсутнічала абшчыннае землекарыстанне,

адкуль нерэальным уяўляўся пераход да калектыўнага карыстання зямлі, што прапаноўвалі расейскія сацыялісты. Так атрымалася, што ідучы ад жыцьця, пісьменьнікі-адраджэнцы былі большымі рэалістамі за палітыкаў. БСГ па перадзеле зямлі меркавала пра ўтварэнне калектыўных гаспадарак: "Добрэ было бы, каб уся вёска чы там часьць яе, калі яна надта вялікая, не дзяліла зямлі, але каб вяла гаспадарку гуртом. Выбрала б яна сабе чалавек пяць такіх, што ўмеюць чытаць ды пісаць і шчоты ўмеюць вясьці, і тыя выбарныя каб запісвалі, сколькі дзён кожны мужык на зямлі працаваў. Прышла восень і з поля ўсё сабралі, кожны ўзяў сабе сколькі хлеба чы чаго, сколькі трэба, каб яму пражыць, пракарміцца, а рэшту прададуць гуртом і дадуць кожнаму столькі грошай, сколькі яму па рабоце выходзіць". Ніводнае загадкі пра магчымасць такога гаспадараньня ні ў кога з беларускіх пісьменьнікаў-адраджэнцаў мы ня знойдзем. Вельмі добра яны разумелі, што такое для сялянаў зямля і што такое на ён сапраўдныя гаспадарскія рукі.

У Я.Купалы ёсьць ці не адзіная, але даволі грунтоўная спроба апісаць ідэальнага селяніна ў вершы "Сьцёпка Жук". Мы мяркуем, менавіта такім, як Сьцёпка Жук, Купала жадаў бачыць кожнага селяніна-беларуса:

Сьцёпка Жук, па бацьку Ёсьцы,
Гаспадар усім на дзіва,
Ўсімі хвалены на вёсцы,
Жыве згодна і пачціва.
Абычай стары шануе,
Не чураецца сярмягі,
Хаты дзедаўскай пільнуе,
Ад суседзяў шмат павагі...
Дзе якое сеяць збожжа, —
Трудна лепш ад Сьцёпкі знаці;
Знацца лепш ніхто ня можа
На ральлі, на сенажаці.
Дзе якая звадка, схопка,
Годзіць, рае ў полі, у хаце, -
Адным словам, як наш Сьцёпка,
Рэдка знойдзеш такіх, браце.
І яшчэ адзін урывак з гэтага верша:
Жыве, праве, шыкам пана:
Крупаў, сала мае многа,
Хлеб вядзецца ж у Сьцяпана
Круглы год, як у нікога.

А хлеб веяны, усё белы...
Эй, што там казаць далёка!
Шнур зямлі ён мае цэлы,
Значыць — поўная валока.
З усёй вёскай ён у згодзе:
"Кепска, кажа, жыці звадай".

Мы бачым селяніна ў дабрабыце і дастатку, які мае зямлю, харчы, актыўна дзеець у грамадзкім жыцьці вёскі, добрага мужа і мудрага гаспадара. Як дабіваецца такога становішча — асобнае пытаньне, але тое, што, у выніку, менавіта такое жыцьцё селяніна-гаспадара, асобы, было меркаю дабрабыту, ідэалам сялянскага жыцьця для Купалы, дзеля чаго і змагаліся беларускія пісьменьнікі-адраджэнцы, няма ніякага сумліву. Дарэчы, у хуткім часе на сваім зьезьдзе БСГ таксама адмовілася ад ідэі калектывізацыі зямлі.

## "БУДУЧНАСЬЦЬ" У БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ ПАЧ. XX СТ.

Літаратура рэдка абыходзіцца без вылучэння пэрспэктываў у жыцьці народа, які даў ёй ход, бо гэта і яе пэрспэктывы. На дзіва маўклівай ў гэтым пляце была беларуская літаратура ў 70-я гады нашага стагодзьдзя. Нічога не сьвяціла наперадзе ні народу, ні ёй. А перад рэвалюцыяй? Ага! Усе толькі і чакалі пераменаў. Кожны ў нечым па-свойму, але ўсе глядзелі ў адзін бок. Аб'ектыўным пунктам адліку было становішча беларускага народа на той час. Чалавек складзены так, што заўсёды яму хочацца верыць у лепшую будучыню. А пісьменьнік і тым болей.

Беларускімі пісьменьнікамі разглядаліся розныя шляхі зьменаў грамадзка-палітычнай ды культурна-нацыянальнай сітуацыі ў краі. Купала, да прыкладу, адзначаў:

"Блудныя сьцежкі цёмнага жыцьця
Навукі сонцам мусім расьсвятляць...
Штандар свабоды хай вядзе усіх
У сьвет на бітву з цемрай і са злом..."
Ён працягваў у гэтым самым вершы:
Навукай, воляй зможам стогн бяды,
Засеем долю на роднай зямлі,
І зажывём шчасьліва мы тады,
Як прадзеды век нашы не жылі.

Усё даволі лягічна: адукацыя — гэтак званая "навука", ды воля вядуць народ непазьбежна да "долі". Я бы мовіў, што гэтыя аспэкты праблемы, вылучаныя Купалам, застаюцца нязьменнымі і сяньня.

Купалам падкрэслівалася немагчымасць у прынцыпе быць шчаслівым у абняволеным, недэмакратычным грама дзтве:

Сумна, сумна жыць на сьвеце,
Жыць, ня меўшы долі;
Ой, сумней жа долю меці,
А ня меці волі!

Толькі воля дае права на шчасьце, сцьвярджае паэта:

Дык завабма ў нашы сеці
Ясназорку волю...
Аб нядолі тады Пеці
Ўжо ня будзем болей,
І так шчасьце будзем меці:
Воля будзе доляй!

Я.Колас гэтаксама абмалёўваў у сваіх вершах тую ненатуральную сітуацыю, якая склалася на той час ў грамадзтве:

Гаварыў ён...
Што так жыць нягожа,
Жыць і гнуцца прад багатым
Поўзаць чарвякамі,
Што даволі ўжо цярпелі
Доўгімі вякамі.

Я.Колас бачыў абавязковаю ўмоваю для зьменаў у грамадзтве шлях аб'яднаньня, сумесных дзеяў:

А каб справіцца з няпраўдай,
З крыўдаю, з бядою,
Дык націснуць трэба людзям
Дружнай грамадою...

Бачылі пісьменьнікі-адраджэнцы і мэту гэтых жаданых пераменаў, якія разумеліся імі як вынік грамадзкай дзейнасьці найперш. Лепшая доля дабываецца працаю ці заваёўваецца:

Выйдзем разам да работы,
Дружна станем, як сьцяна,
І прачнецца ад дрымоты
З намі наша страна!

- пісаў Я.Колас. Тое ж чытаем і ў Купалы:

Працай усё зможам, новы быт зложым,
Гора затопчам сільнай нагой,
Зможам нядолю, зможам няволю,
Сьветач запалім шчасьця свайго!

Будучнасьць у разуменьні беларускіх творцаў — гэта і канкрэтыка, зразумелая кожнаму селяніну-беларусу, так бы мовіць, прагра-

ма-мінімум. Найбольш поўна яе адбіў Я.Купала ў вершы "Чаго нам трэба":

Трэба нам, трэба перш-наперш хлеба,
Хлеба, каб стала на цэленькі год,
Дроўцаў палена, конікам сена,
Капейку якую сабе на зварот.

Трэба нам, трэба, як сонца з неба,
Лепшы, даўжэйшы зямелькі шнурок,
Сытай скацінкі, новай хацінкі,
Каб красаваўся пры хатцы садок.

Размова ідзе аб дастатак у беларускай сялянскай сям'і, яе забясьпечанасьць харчамі, і як аснова гэтага дастатку — наяўнасьць зямлі, гаспадаркі, жытла. Купала "папросту" піша пра нармальнае чалавечае жыцьцё для беларуса, якое выражаецца і ў тым, што ў сям'і павінны быць "боты на ногі, мультан жонцы на лепшы каптан". Далей згадваецца ім адукацыя. Беларусу трэба "Кніжак для дзетак, Трэба нам школы па вёсках прыдбаць". Затым — прававая дзяржава, што бараніла б інтарэсы грамадзянаў:

Жыць сьмела ў хатцы і не баяцца,
Каб не ганялі у воласьць, у стан.

Не забывае Купала паўсюдную медыцынскую дапамогу, дармовую для бедных:

Доктара трэба, шпіталь нам трэба,
Дарма лячыліся б дзе бедакі;
а таксама сацыяльнае забесьпячэньне:
З торбай жа ў старасьць каб не цягацца,
Трэба ўстроіць прытулак такі.

У гэтым вершы паэта выклаў цэлую праграму сацыяльных пераўтварэньняў, якія неабходныя, на ягоны пагляд, беларускай сялянскай грамадзе.

Купала малюе будучыну і бачыць там прававую дзяржаву, якая б вырашала ўсе пытаньні дэмакратычным шляхам, якая б гарантавала ўласную незалежнасць кожнаму:

На насадным месцы б селі
Права і закон,
Праўду вечную ўсе б мелі —
Вечавы свой звон...
Кожны сам сабе ад рана
Малаціў бы цэп.

У вершы "Змачу пёрка..." паэта таксама выказвае асноўныя моманты, якія ён жадаў бы бачыць у будучыне. Гэта і дэмакратычны лад і адукацыя і матэрыяльны дабрабыт народа:

Глянем, у адной з іх кучы
Прачытаем: "усе брацьці!"
У другой — гоман траскучы:
"Няма невукаў у хаце!"
А ўжо ў трэцяй дык свабоду
Бачыш вольную пад неба;
А ў чацьвёртай — "для народу
Досыць грошы, досыць хлеба!"

Асноўныя дэмакратычныя зьмены бачацца ў будучыне і Я.Коласу.У першы "На Новы год" Я.Колас хоча ўбачыць у гэтым новым годзе сацыяльны дабрабыт (Каб больш сьлёзы не ліліся, Каб не падаў чалавек), зьмену палітычнага ладу (Каб астрогу заперліся Ад людзей на вечны век... Каб са страхам не глядзелі на ўраднiцкі каўнер), свабоды слова (Каб казалі, што хацелі), перадзел зямлі (Каб пабольшала нам поля), дэмакратызацыю грамадзтва (Каб сьпявалі песьні волі).

Акрамя, так бы мовіць, набалелых, першасных задачаў, вырашэнне якіх бачылася нашым пісьменьнікам-адраджэнцам, яны імкнуліся зазірнуць і ў больш далёкую будучыну. Паспрабаваць зазірнуць самім дый іншых Падахвоціць. Гэтая будучына мроілася ім недастаткова выразнаю і акрэсьленаю. Купала, дапрыкладу, заклікаў да кардынальнай перабудовы грамадзтва, перагляду шляхоў ягонага разьвіцьця, пазбаўленьню ад злога і несправядлівага, маючы на ўвэце гуманныя асновы ў будучыне новага грамадзтва:

Трэба злое ўсё разтрэсьці,
Сонных разбудзіць,
Трэба новае ўсё ўзьнесьці,
Новы шлях адкрыць.

Што рабіў бы чалавек, як бы перад ім не мігцела няпэўная, але ж такая прынадная зорка шчасьлівае будучыны? Моладзь і таго болей аптымістычная. Купала прасіў у сонца:

Распалі агні
Веры ў будучнасьць,
Што дзён лепшых мы
Дачакаемся.

Была ў паэты "у будучнасьць ясну надзея і вера". Ідэалёгія адраджэньня, зладжаная на веры ў лепшую будучыну, у безумоўнае адраджэньне нацыі вадзілі рукою паэты:

Згіне гора і сьлёз мора, —

Ня вечна напасьць!
Купала перакананы:
Буйна ўзойдзе наша ніва,
Будзе волі, хлеба.
Ён шчыра пераконвае астатніх:
Блізкі той дзянёк, калі
Шчасна запануем,
Станем самі мы людзьмі
І край адбудуем.

Будучына ўяўляецца паэту падкрэсьлена нерэальнай, а рацыянальнай і адначасна неўтаймавана прыцягальнай. Часам гэта зорка, якая:

...душу надзеяй сьветлай
Вабіла ня раз.
Вабам шчасьця і дастатку
Падклікала ўсяк.

А часам яно заключаецца для паэты ў магічным слове-шчасьце. Яно ў Купалы — сінонім будучыны:

Рухне ўсё, што з веку сходзе,
Ляжа к шчасыцю сьлед;

Шчасьце, за якое варта змагацца і да якога клічуць "сурмы баявыя" ўсяіснае і ўсёахопнае:

Аб славе цуднай граюць сурмы,
Аб шчасьці люду ўсяго;
Аб ім сьпяваюць паэты — пракокі будучыні:
Пяюць аб шчасьці, добрай долі,
Аб волі шчырай для людзей.

Ва ўяўленьні Купалы яно, гэтае шчасьце-будучына — нешта незвычайнае:

Пойдзем...
К лепшай долі з вялікай надзеяй...
Пойдзем шчасьце сабе будаваць небылоё.

Паэта ўпэўнены, што пасьля барацьбы і працы, па сёньняшнім цяжкім часе нас чакае вечнае шчасьце: Крыху адвагі й дружнай сілы,

А шчасьце вечна зацьвіце.
У той самы час Я.Колас піша:
Вер, брат, — жыцьце залатое
Будзе ў нашай старане.
Алесь Гарун абяцае беларускаму народу:
Годзе спаць! І ні будзе начы,
Будзеш вольны, разумны, багаты!

Я.Купала накідае рысы, якія ён бачыць у будучым грамадзтве:

К свабодзе, роўнасці і знаньню
Мы працярэбім сабе сьлед!
І будзе ўнукаў панаваньне
Там, дзе сягоньня плача дзед!

Гэтыя ж рысы "роўнасці, вольнасьці, брацтва" хоча бачыць у будучыні "веку красы, хараства" і А.Гарун. Будучына ўяўляецца яму збудаванай па прынцыпах роўнасьці і волі. Ён мянуе яе "залатым сном". Я.Купала ўяўляе дарогу да будучыні "залатым шляхам", па якому мы

Зорна ўзьнясёмся ў высоты
Вышай няпраўды, нясълавы,
Вышай пакутных балетаў.
Там, у будучыні
Слова, дум ніхто ня зьвяжа,
Жыць, цярпець ня будзе страх!
Там і веліч Бацькаўшчыны:
Зацьвіце яна, як сонца
Пасьля непагоды,
Ў роўнай волі, ў роўным стане
Між усіх народаў.

Там — росквіт роднае мовы, бо "гэты скарб нам на вечныя годы", — сьцьвярджае А.Гарун.

Як жыло ты з намі — будзеш вечна жыці,
Грамадой мільёнаў з сьветам гаманіць...

- прарakye веруючы ў безсьмяротнасьць беларускае мовы Янка Купала.

Надзвычай цікавы малюнак будучыны ў Алеся Гаруна ў вершы "Муляру". Паэта ў ім спрабуе вызначыць падмурак, на якім будзе пабудавана грамадзтва ў будучыне:

Мур вялікі, вольнай волі,
Мур высокі да нябёс,
Мур братэрства, роўнай долі,
Мур для радасьці без сьлёз.

Будынак будучыны ў А.Гаруна ідэальны, ні на што не падобны па прыгажосці:

Сьцены зробім чыста, гладка,
Як с крышталю, столь як шкло,
Скажуць людзі: "вось дык хатка!
Роўнай ў сьвеці ні было!"

Наіўная і па-мастацку зьдзіўляючая карціна жыцьця людзей у гэтай паўказачнай будучыне:

Будзем есьць ў гэнай хаці
Смачны, чысты, пульхны хлеб.

Мары, мары... Шлях у будучыну аказаўся далёка не такім светлым, як яго ўяўлялі нашыя пісьменьнікі-адраджэнцы. Магчыма таму, што не яны і ня іхнія аднадумцы аказаліся мулярамі адвечнае чалавечае мары — імкненьня да справядлівага грамадзтва.

## НАЦЫЯНАЛЬНАЯ СЬВЯДОМАСЬЦЬ І БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА НА ПАЧАТКУ XX СТАГОДЗЬДЗЯ

Этнічная сьвядомасьць нацыі — магутная сіла ў грамадзкіх адносінах, дзякуючы якой беларусы захаваліся як этна-культурная супольнасьць у цяжкія часы існаваньня нацыі ад 17-га да 19-га стагодзьдзя. Але рух па інэрцыі, зададзены незалежнасцю беларускае дзяржавы — Вялікага княства Літоўскага ў сярэднявеччы, росквітам у ёй беларускай культуры, паступова замаруджваўся, і без сьведамага падмацавання непазьбежна прывёў бы да развалу і дэградацыі беларусаў.

Адраджэнчыя працэсы, накіраваныя на захаванне нацыянальнае сьведамасьці беларусаў, што пачаліся на Беларусі ў 19 ст. разам з эпохаю асветніцтва, здолелі сфармавацца ў рэальны рух толькі на пачатку XX ст. Умоўнаю мяжою гэтага руху для мяне ёсьць кніжачкі Францішка Багушэвіча.

І вось хутка ўжо як сто гадоў адное пакаленьне сьведамых беларусаў замяняецца другім, вырашаючы галоўную задачу свайго жыцьця — даводзячы народу думку пра тое, што ён не горшы ад астатніх і мае гэткае ж права на існаваньне.

Незалежнасьць у гэтым выпадку — найбольш гарантаваная форма жыцьця для кожнае нацыі. Асабліва для беларусаў, заціснутых як паміж молатам і кавадлам, паміж дзвюма вялізнымі і агрэсіўнымі нацыямі — расейцамі і палякамі.

Беларускі нацыянальны рух няўхільна прыйшоў да гэтае ідэі і голасна абвясьціў яе пад час першае сусьветнае вайны і з тае пары шчодра абмыў яе ахвярнік крывёю дзесяткаў тысяч сваіх дачок і сыноў.

Мы маем за сабою амаль стогадовую гісторыю змаганьня за беларускую душу і адчуваем сябе досыць упэўнена на гэтым грунце. А з чаго ж пачыналі яны, нашыя папярэднікі — адраджэнцы? Людзі,

якія выспелілі ідэю вартаснасьці беларускае нацыі і безаглядна паверылі ў беларускі шлях?

Задачы перад беларускімі адраджэнцамі стаялі іншыя ад цяперашніх. Ім прыходзілася пачынаць ледзь не з нуля, адно, маючы за сабой вялізны людзкі беларускі масіў. Закранем толькі некаторыя аспэкты, што разглядаліся ў мастацкіх творах беларускімі паэтамі на пачатку XX ст.

Вызначэнне этнасу і дасюль ідзе ў асноўным у рэчышчы: мы — яны. Калі ёсьць гэтая мяжа, значыць ёсьць і этнас. Сцьвярджэньне нацыі складаецца ў вылучэнні нацыянальных кампанентаў са стану няпэўнасці. Таму даволі часта самабытнасць беларускага народу, яго адрозьненьні ад суседніх народаў у гісторыі, культуры, мове, палітычным і нацыянальным жыцці вызначаліся пісьменьнікамі-адраджэнцамі шляхам супастаўленьня з іншымі народамі, звычайна суседзямі, якія мелі найбольш адмоўны ўплыў на разьвіцьцё нацыянальнай самабытнасці беларусаў — расейцамі і палякамі.

Фармаванне нацыянальнага "я" ў вялікай ступені залежыць ад таго, наколькі гэтае "я" вылучаецца ня толькі аб'ектыўна, з прычыны сваёй самаіснасьці, але й суб'ектыўна, для кожнага прадстаўніка нацыі асобна. Адным словам, мала таго, што ты з пэўнага роду. Але ці разумееш ты гэта, і ці збіраесься адстойваць сваю прыналежнасць да гэтага роду, да ягонае мовы, культуры, звычаяў? Ці зьбіраесься перадаваць памяць рода сваім дзецям? Тое ж тычыцца і беларусаў у прыватнасці.

Купала накмячае асноўныя пастуляты, якія дазваляюць быць беларусу гаспадаром на сваёй зямлі, аб'ядноўваюць яго ў народ, нацыю:

Маю родну мову, край, -
Кажуць мне так людзі, -
Толькі выпрастайся, знай,
А твой верх тут будзе!

У той час як беларуская патрыятычна ўзгадаваная інтэлігенцыя імкнулася замацаваць адрозныя нацыянальныя рысы ў сьвядомасьці беларуса, вывесці яго са становішча непаўнавартаснага, прамежкавага, "тутэйшага", польскімі і расейскімі шавіністычнымі коламі вялася вайна за. беларускую душу і грунтавалася яна найперш на канфэсыйнай прыналежнасьці, на формуле: каталік — паляк, праваслаўны — расеец.

Беларуская ж інтэлігенцыя сфармулявала сваю асноўную тэзу гэткім чынам: свой — чужы.

Акрамя нацыянальнага падтэксту (свае — тыя, хто гаворац, жывуць гэтак як і мы), гэты падзел супаў і з падзелам сацыяльным, маёмасным. Свае — тыя, хто працуе гэтак як я, як правіла, на зямлі, ці з гэтага роду. Чужыя — паны-палякі, расейская адміністрацыя. Пра гэбраяў з-за іхняй вялікай нацыянальнай адрознасці нат' і не вялося гаворкі. І так зразумела, што не свае.

Найбольш небяспечнымі ў асіміляцыйным пляце былі свае браты-славяне. І менавіта да іх зьвяртаецца Я.Купала, як да чужых:

Загаманілі, зашыпелі
Вось так, па-своему "вовсю"...
Няварта гэтак распінацца,
Мае шмялькі, ў чужым вульлі.
Зацесна вам у нашай хатцы —
Гайда! туды, адкуль прыйшлі!...
Як трутні, ласыя на соты,
Вы к нам прыйшлі ў гадзіну бед;
Чуць толькі сталі да работы,
А груганам гатоў абед.

Пафас гэтага верша Купалы накіраваны супраць расейскай шавіністычнай бюракратыі, якая навалілася на Беларусь пасьля яе анэксыі ў канцы 18 ст. Асабліва ўзмоцніўся працэс русіфікацыі пасьля паўстаньня 1863 года. Менавіта гэтыя вехі, як нам здаецца, меў на ўвэце Купала пад "гадзінай бед". Зразумелая задача прышлай навалы:

Купляюць, збываюць, гандлююць чужынцы
Народным дабром, як сваім...

зразумелыя для паэты таксама іхныя маральныя, палітычныя ўстаноўкі:

Цямніц і вісельняў асновы,
Слугі нагайкі і штыха,
Сумленьне, край прадаць гатовы
За бліск нагруднага значка.

Купала даволі выразна выказвае свае адносіны да "апекуноў" беларускага народа, мяркуючы аб верагоднасьць непадлеглага жыцьця для беларусаў, падводзячы чытача да вызваленчых, незалежніцкіх задач адраджэнчага руху. Паэта крытычна ацэньвае час уваходжаньня Беларусі ў склад Расейскай імпэрыі:

Што вы прынесьлі? Што?
Загляньце
Да беларуса сумных хат...
З тых самых лык пляце ён лапці,

Якія плёў сто год назад.

Нічога не зьмянілася ў жыцьці карэннага народа гэтай зямлі — беларусаў. Лягічны працяг — які ж сэнс беларусам уваходзіць у склад гэтай "турмы народаў"? У канцы верша Купала выказвае ўпэўненасць у перамозе "праўды", у тым, што беларускі народ стане гаспадаром на сваёй зямлі. Паэта не імкнецца дакладна прадказаць будучыню — у якой канкрэтнай форме ён бачыць волю для Беларусі — фэдэрацыі, аўтаноміі ці поўнай незалежнасьці, але ён упэўнены ў канцовым станоўчым выніку барацьбы:

Не вам, не вам! гасіць паходні,
Што распаліў жывы народ!
І праўда возьме верх нязводне:
Такі ўжо сонца вечны ход.

Паэта не сумляваецца ў аб'ектыўнасці і непазьбежнасьці разьвіцьця адраджэнчага руху, які імкнуўся да найбольш дасканалага нацыянальна-дзяржаўнага ўладкаваньня, якое заключалася ў супадзеньні нацыянальных і дзяржаўных межаў.

У нялёгкім працэсе нацыянальнага ўсведамлення заўсёды значнае мейсца займае імкненьне зразумець і адчуць папярэдні шлях народа, г.зв. беларускі шлях. Што прывяло беларусаў да цяперашняга стану? Якім ён быў, гэты шлях? Купалу ён бачыўся такім:

Шмат лет не ручыла нам доля...
Хто мы, адбірала нам памяць,
Чужыншчынай ціснула грудзі,
Ня раз падцікалася з думкай,
Што мы ўжо — ня мы і ня людзі.

"Чужыншчына" — шматгадовая чужая ўлада, чужыя парадкі, канстатуе Купала, прывялі да драматычнага становішча беларускі народ. У беларускіх адраджэнцаў быў дакладны гістарычны арыентыр, ад якога пачаўся шматвекавы ўпадак беларускага народа — "залаты век". Беларусам ёсьць чым ганарыцца, але зноў жа:

Простая нашых прадзедаў слава,
Хоць апаганена мудрым чужынцам;

Алесь Гарун гэтак паказваў гістарычны шлях разьвіцьця беларусаў:

У старышу Беларус, ні падданы,
Гаспадарыў, быў сам над сабою
І далёка ў сьвеці быў знаны
За літоўскай і ляшскай зямлёю.

У час "нядолі" на гістарычным шляху беларускі народ перастракаюць "чужынцы": у 17—18 ст. — палякі, у 19-20 — расейцы. А.Гарун

паказвае поўнае непрыйманьне такіх "гасцей", рэзка адмоўна ацэньваючы іхнюю прысутнасць "у сялянскай аграбленай хаце":

Хто хацеў, той і сьмеў рабаваці,
Без прыпросу з'ежджаліся госьці -
Абдзіраць, аб'едаць, апіваці
І крышыць гаспадарскія косьці.

- ні ценю спагады, ні кроплі жаданьня хоць неяк больш міралюбна ацаніць дзейнасьць "чужынцаў" — расейцаў ды Палякоў. Іхнія дзеі паэта расцэньвае як дзеі акупантаў, ворагаў беларуса.

Гэткую ж карціну акупацыі, захопу края апісвае Я.Купала ў вершы "Забраны край" ("забраны" — захоплены гвалтоўна):

Сьляпы зьнемагаецца бацька ў цямніцы;
На стражы пастаўлен сынок;
У поўных калісьці ад шчасьця сьвятліцах
Чужак зьневажае дачок.
Дзяцей сваіх маткі кідаюць у зьдзеку,
За "мамак" к наездцам ідуць,
А тыя за іх малако, за апеку
"Забраны край" болей гнятуць.

Купала апісвае як паступова рэальная ўлада пераходзіла ад беларусаў да чужынцаў:

Мы нясьлі — ўсё ныла, гінула памалу,
Аж не нашай наша бацькаўшчына стала.
Не для нас сасонкі нашы зашумелі,
Не для нас пасевы нашы зарунелі;

Родная зямля пераходзіць у рукі чужынцаў і становіцца чужой для народа — жахлівая, разбуральная хада асіміляцыі, духоўнага прыгнечання:

Усё роднае стала няродным,
Прост хоць і на сьвеце ня жыці.

Менавіта таму супрацьпастаўленне беларусаў чужынцам успрыймаецца намі як ачышчальны, адраджэнца рух, нацэлены на вяртаньне праўдзівых правоў беларускаму народу.

Працэс аддаленьня народа ад ягоных каранёў, ад ягонага гістарычнага мінулага непазьбежна прыводзіць да дэвальвацыі духоўных каштоўнасьцяў, створаных гэтым народам, страты павагі да яго з боку прадстаўнікоў іншых нацыяў, тым болей, калі яны складаюць на гэты момант кіруючую частку грамадзтва. Такое становішча адчуджанасьці беларускага народа заўважае пранікlівы геній Купалы. Селянін, які спрадвеку жыве на гэтай зямлі і займае падкрэсьлена

нейтральную пазыцыю, нікуды ня ўлазіць, раптам з подзівам заўважае:

Праўда — штось як чужняком,
Кожны мной піхае;
Ці ж адным мной? Эй, Арцём,
Твая хата з краю!

Купала спрабуе асэнсаваць становішча, у якім апынуўся беларускі народ. Ён зьвяртаецца да Бога, сыходзячы з прынцыпа Боскай наканаванасці:

Ты ў цьвет сваіх нялічаных народаў
Мінуўшчыну і будучыну ўбраў,
А ў нас — караючы чужой свабодай —
Мінулае — і тое адабраў.

"Чужая свабода" тут — навязаная звонку, накінутая "чужынцам" і ёй можна толькі пакараць народ.

Радкі гэтыя напісаныя да рэвалюцыі і тым ня менеей яны прадбачваюць ужо "свабоду", якую прынеслі беларусам на жаўнерскіх багнэтах Мясьніковы ды Кнорыны.

Далей у вершы гучаць ужо знаёмыя нам матывы:

Прадаў на глум і годным, і нягодным
Усё, што ёсьць сьвятым для нас і ў нас;
Мы дома — як ня дома, правам родным
Сваім ня сьмеема пажыць хоць раз.

Купала з адкрытай няпрыхільнасьцю ставіцца да "чужынцаў", вінавацячы іх у дэскрэдытацыі таго, "што ёсьць святым для нас" — традыцыйным пачатку асіміляцыі ўсякага народу. Купалам выказваецца жаданьне народа жыць "правам родным", адпаведна да сваіх нацыянальных традыцыяў, згодна сваіх святыняў, затаптаных "чужынцамі" у бруд. І зноў Купала падводзіць чытача да лягічнага завяршэньня сваёй думкі — дабіцца жыць "правам родным" можна толькі існуючы незалежна ад "чужынцаў". У канцы верша Купала просіць у Бога: "Вярні нам Бацькаўшчыну, Божа", маючы на ўвеце і вольнае незалежнае жыцьцё народа ў гэтай Бацькаўшчыне.

Прозьба вярнуць страчанае, мае на ўвазе ранейшае валоданьне ім. Непазьбежна мы звяртаемся да "залатога веку" у жыцьці беларускага народа. Заклікам да беларусаў адкінуць усё, накінутае ім чужынцамі, гучыць верш Купалы "Годзе". Купала спрабуе вызначыць далейшы лёс беларускай культуры, бачучы пэрспэктывы яе разьвіцьця ў самабытнасці і незалежнасьці:

Годзе заходняй ці ўсходняй культуры!
Для беларуса цана ім адна,

Усе вы, панове, аднакай натуры:
З сэрца чужога кроў ссалі б да дна.

Гэта не заклік да самаізаляцыі. Гэта жаданьне убачыць беларускую культуру самастойнай і вартаснай, самадастатковай для далейшага ўласнага разьвіцьця, не служачай крывёю для напаўненьня жылаў іншых суседніх культураў. Горкі вопыт страты талентаў беларусы ўжо мелі. Дастаткова згадаць Міцкевіча, Сыракомлю, Манюшку, а таксама Сымона Полацкага, Дастаеўскага, Глінку. Няўстрыманае жаданьне Купалы бачыць народ незалежным, роўным сярод роўных эўрапейскіх народаў:

Годзе нам есьці аб'едкі і косьці,
Злыбедзе ўсякай паклоны дарыць!
Гаспадары мы ў сябе, а ня госьці,
Час к панаваньню нам сьлед церабіць!

Заклік Купалы да самастойнасьці тычыліся ня толькі культуры. Дзесяткі і сотні тысяч беларусаў жылі палітычным, эканамічным жыцьцём іншых народаў, найперш сваіх магутных суседзяў, не прыносячы карысьці свайму краю:

Мы калі ўміралі, то ішлі на муку
Для чужой карысьці, пад чужой прынукай.

Купала яшчэ і яшчэ раз апісвае карціну пагібелі беларускіх сыноў для славы "чужынцаў":

Белы косьці, што гублялі
Беларускія сыны,
Што сабе кавалі путы,
Ў бітвах мручы за другіх...

З асаблівым трагізмам гэтыя матывы загучаць ў Купалы у часы грамадзянскай вайны, калі зноўку беларусы паміралі за гонар і славу іншых народаў, дапамагаючы "чужынцам" палавініць сваю Бацькаўшчыну. Паэта паўставаў супраць гэтага:

Годзе нам сілу прыблудаў вялічыць
Дзецьмі, багацьцем радзімай зямлі!
Ды ў якія ж часы ў нас слухалі паэтаў?

Апісваючы стан беларускага адраджэньня, Купала часта супрацьпастаўляе "маладой Беларусі" — "чужынцаў", скіраваных супраць яе. У вершы "Маладая Беларусь" Купала піша:

Дарма хэўры чужынцаў мяне застаўляюць
Пакланяціся ім, прадаюць і купляюць
І апекай сваёй зьневажаюць мяне...

У гэтых пярэчаньнях у Купалы назіраюцца матывы пратэсту, нязгоды з існуючым парадкам нацыянальнага прыгнёту:

Здушылі мне голас на родных на нівах;
Крыж цяжкі упадку з народам нясла,
І думаў чужынец, што я ўжо няжыва.
Ня верце! Жыву, як ад векаў жыла!

Купала ацэньвае моц нацыі і упэўненасьцю глядзіць у будучыну:

Нас восем мільёнаў! — эх! бі нам паклоны,
Чужнік ўсяк, прыліпшы да нашай зямлі!

Пакуль што гэта толькі ўяўляемая ім, патэнцыяльна магчымая зьверхнасьць, якая, па ягоным перакананні, хутка пераўтварыцца ў рэальную, сьведамую нацыянальную сілу, што стане вызначальнаю ў краі.

Але адначасна з такімі аптымістычнымі прароцтвамі мы бачым створаныя паэтам малюнкі, поўныя крыўды, зьнявагі і пагарды да свайго народа. Яны былі часткова гіпербалізаваныя Купалам (паэт часта выкарыстоўваў гэты псыхалягічны прыём — адчуванне прорвы, давядзеньне становішча да канцовага пункту прымушае супраціўляцца, абурацца, падпіхвае да дзеяў, абуджае пакрыўджаны гонар), але ж у цэлым несьлі суровую, балючую праўду:

Ці ж нас такое з роду ўжо пракляцьце
Зачаравала чарамі сваімі,
Што мусім мы пад вокнамі стагнаці,
Губляці пад крыжамі сваё імя,
Й не знаючы век бацькаўшчыны-маці,
У ёрмах валачыцца між чужымі?..

Дзе-нідзе Купала называе гэтых "чужынцаў", якія, на яго думку, узьдзелі ярмо на беларусаў, аднялі імя і айчыну. У вершы "Папросту" Купала абмалёўвае маральнае аблічча беларускага народа:

Простым мы словам з сьветам гаворым,
Песьні аб цяжкай творым нягодзе,
З думкамі рвёмся к сонцу і зорам.
Рвёмся к свабодзе.

Паэта пералічвае лепшыя рысы ў характары беларускага народа, адзначаючы прастату, дэмакратызм, вернасьць роднай зямлі.

Красьці ж ня пойдзем, хоць у каморы
Кожны к нам прэцца.

- з годнасьцю гаворыць Купала. Характар беларуса ў вершы вылучаецца менавіта гэтай напоўненасьцю ўнутранай годнасьцю, цьвёрдасьцю і перакананасцю. Выказваючы асноўнае, на думку Купалы, жаданне беларусаў: "Каб стаць раўнёю, славай і сілай іншым народам", паэта называе асноўныя сілы, што перашкаджаюць гэтаму:

Проста жывём мы, як доля лучыць,

І крывадушыць не прабавалі...
Просім папросту: кіньце нас мучыць,
Ляхі, маскалі!

Вось так. Кропкі над "і" расстаўленыя. Рэчы названыя сваімі імёнамі. Пры веданьні хваробы трэба думаць, як яе вылечыць. Верш гэты доўгі час не друкаваўся. Мабыць, ня ўсім падабаліся "папросту" сфармуляваныя Купалам высновы.

Зразумела, пад "ляхамі" ды "маскалямі" купала меў на ўвеце найперш тую частку гэтых народаў, якая прыймала найбольш інтэнсіўны ўдзел у калянізацыі Беларусі і асіміляцыі беларусаў, хаця, зноў жа, пэўне, што адказнасьць за дзеі часткі нацыі кладзецца на ўсю нацыю, бо, уважліва разглядаючы такія катэгорыі як нацыянальная псыхалёгія, нацыянальны характар, звычаі, урэшце рэшт спамеры нацыі, можна прыйсці да высновы, што яны таксама ўплываюць на палітыку экспансіі, калянізацыі, якую сьведама праводзяць ідэалягічныя і палітычныя колы гэтае нацыі.

У гэтай "простай" прозьбе Купалы мы таксама бачым ягонае жаданьне ўбачыць беларусаў вольнымі ды незалежнымі. Нашыя меркаванні пацьвярджаюцца больш выразным супрацьпастаўленьнем Купалам свайго героя-барацьбіта расейскаму, царскаму самаўладдзтву, паказанага паэтам праз непрыемны, мабыць, для кожнага расейца вобраз "прыблуды з-пад Нявы крывавай"...

Рэзкім процістаяньнем беларуса і "апекуноў" вылучаецца верш Купалы "Ворагам беларушчыны". Таксама гэтай тэме прысвечаны сатырычны верш Купалы "Усе саюзы", дзе паэта крытыкуе русафільскія саюзы на Беларусі — "Крестьянин" і "Белорусское общество":

Усе саюзы ў беларусаў,
Ўсё апекуны, —
А бадай жа на іх немач!
Адкуль жа яны?!

Нягледзячы на тое, што новаўтвораныя таварыствы іменаваліся "беларускімі", Купала скептычна ацэньвае іхнюю беларускасьць, падкрэсліваючы іхнюю чарнасоценную, "истинно русскую" пазыцыю:

Саланевіч ды з кампаняй
Сцапаў гэту мысьль,
А ўсё "истинным" там духам
Сьмярдзіць, знай, дзяржыся

У верш трапіў і шырока вядомы кіраўнік "истинно русского" народа на Беларусі, рэдактар шавіністычнай газэты "Северо-Западная жизнь" Саланевіч, з якім беларуская публіцыстыка вяла жорсткую барацьбу на старонках "Нашае Нівы". У нацыянальным пытаньні "Са-

ланевіч і кампаня" прытрымліваліся афіцыйнае вэрсыі, уважаючы Беларусь за "Северо-Западный край", а беларусаў за этнаграфічнае расейскае племя. Такая арыентацыя адразу ж ставіла пад пытаньне карысць ад іхняй дзейнасці, незалежна ад таго, што таварыства і менавалася Беларускім. Пра гэта адкрыта піша Купала:

Ох, паможа саюз гэткі
Беларусі нашай,
Як "Крестьянин", як знаёмы
У хваробе кашаль.

У байцы "Лякарства" Купала апісвае сцэнку з міжнацыянальных адносінаў: счапіліся беларус з палякам, у выніку выйграе "цень мураўёва" — расейскае самаўладзьдзе. Гісторыя ў нечым паўтараецца і зараз, калі спрабуюць пасварыць літоўцаў з беларусамі і зноў выйграе ад гэтага "цень мураўёва" ў новым абліччы — расейская савецкая імпэрыя. Перад агульнай небясьпекаю ўсе ўнутраныя звады павінны адыйсьці на задні плян, сьцьвярджае Купала:

Чытач, ты толькі не пужайся:
Літвін і Лях, жывым застаўся,
Яшчэ дазналісь, што ў нягодзе
Вада халодная ня шкодзе.

Такой халоднаю вадою для беларусаў і Палякоў была царская каланіяльная палітыка на ўскраінах Расеі, як і зараз для беларусаў і літоўцаў — палітыка цэнтра, Масквы.

Разьмежаваньне — "свае — чужыя" ў Купалы не заўсёды мела экспрэсіўную афарбоўку. "Чужыя" у паэты не заўсёды ворагі. Часам гэтае азначэнне нэйтральнае і падае толькі адное, што гэта — не беларусы. У вершы "Памяці Палуяна" Купала пісаў пра яго:

Шукаў ўсё праўды між чужымі і сваймі.

"Чужыя" тут азначаюць Украіну ды ўкраінцаў, сярод якіх некаторы час жыў Палуян і ня маюць адмоўнае сэнсавае афарбоўкі.

У любым выпадку, які б сэнс Купала ні ўкладаў ў азначэньне "чужы", процістаўленьне беларусаў іншым народам, вылучэньне іх сярод іншых, спрыяла этнічнай кансалідацыі беларусаў, росту нацыянальнай сьведамасьці.

## МІНУЎШЧЫНА НАШАГА КРАЮ Ў БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ ПАЧАТКУ XX СТАГОДЗЬДЗЯ.

Перад маладой беларускай інтэлігенцыяй, якая на пачатку XX стагодзьдзя сфармавалася ў выразную нацыянальную адраджэнчую плынь, непазбежна паўставала задача адраджэньня гістарычнай

самасвядомасьці беларусаў. У значнай ступені гэтая праца была зробленая беларускімі пісьменьнікамі, якія складалі арганічную частку беларускага адраджэнчага руху і прыймалі чынны ўдзел у палітычнай ды ідэалягічнай барадзьбе на Беларусі.

Зварот да гісторыі народа — абавязковы этап у адраджэнні і станаўленьні ўсялякай нацыі. Не абмінуў гэты працэс і беларусаў. Янка Купала ў вершы "Маладая Беларусь", пералічаючы набыткі "маладой Беларусі", беларускага адраджэнчага руху, адзначаў між іншым: "узьнімаеш мінуўшчыну даўнюю". Без асэнсаваньня перажытага цяжка арыентавацца ў сучасных падзеях,ісьці праўдзівым шляхам і тым больш зазіраць у будучыну, упэўнены паэт. Купала зьвяртаўся да сваіх сучаснікаў:

Зайдзі на магілкі з крыжамі
І насып забыты крані;
Пакратай мінуўшчыны попел,
Што ў казках ня кінула жыць;
Сягоньняшні дзень паймі добра,
Што ўсьлед нашай долі бяжыць...

Балазе, у нашай гісторыі ёсць што згадваць, асэнсоўваць, параўноўваць з рэчаіснасцю і рабіць адпаведныя высновы.

Адзін з асноўных матываў, які гучаў у вершах паэтаў-адраджэнцаў, было апяваньне магутнасьці беларускага народа, яго вольнасьці і дзяржаўнай незалежнасьці ў сярэднявеччы. Нашая мінуўшчына давала поўнае маральнае, гістарычнае, юрыдычнае права беларускаму народу дабівацца аднаўленьня былых набыткаў ва ўмовах новае палітычнае сітуацыі.

У сваіх пошуках, закладаючы супольна з палітыкамі падваліны нацыянальнае ідэалёгіі, беларускія паэты абапіраліся на гістарычныя працы і погляды вядомых прагрэсіўных беларускіх гісторыкаў: М.Доўнар-Запольскага, В.Ластоўскага, Е.Раманава, Я.Карскага ды інш.

Сьціслa погляды беларускіх гісторыкаў на сярэдневяковую гісторыю Беларусі можна выкласці наступным чынам: дзяржаўнасьць на Беларусі ўзьнікла ў XI ст. адначасна з утварэньнем раньнебеларускіх дзяржаўных аб'яднанняў, насамперш Полацкага, а таксама Смаленскага, Тураўскага ды іншых княстваў. Дарэчы, гэткай жа думкі на першапачатковую дзяржаўнасьць Беларусі прытрымліваюцца і сучасныя прагрэсіўныя гісторыкі, у прыватнасці М.Ермаловіч і Г.Штыхаў.

Наступны важны момант: аб'яднаньне беларускіх земляў у Вялікім княстве Літоўскім не выклікала страты беларускім народам сваіх палітычных, культурных, эканамічных правоў, а наадварот спрыяла яго кансалідацыі, росквіту беларускай культуры, навукі, мастацтва,

узроўня праўвавой, дзяржаўнай сістэмы, аб чым сведчыць статут дзяржаўнасьці беларускай мовы ў Вялікім княстве Літоўскім, выданне "Бібліі" Францішкам Скарынам, "Статута Вялікага княства Літоўскага", посьпехі ў зьнешне-палітычным ды ўнутраным жыцьці дзяржавы, урэшце, адсутнасьць вялікіх сацыяльных узрушаньняў, што падкрэслівала стабільнасьць сітуацыі ў краіне. Адным словам, тое, што ўвабрала ў сябе ёмкая метафара — "залаты век".

Усё гэта ў сканцэнтраваным выглядзе выяўлялася ў творчасьці беларускіх паэтаў-адраджэнцаў. Часам — як толькі згадкі пра мінулую гучную славу беларусаў. Купала, у прыватнасці, просіць песьняра запяяць

Аб той славе небывалай
Нашае зямлі,
Дзе мы долю пахавалі,
Скуль бяду ўзялі;

Паэт адначасна з крыўдаю і гонарам сьцьвярджае: Простая нашых прадзедаў слава, Хоць апаганена мудрым чужынцам;

Гаворачы з "братам-беларусам", Купала мянуе гісторыю беларусаў "Дзіўнай аповесьцю мінуўшай славы і жыцьця". Карусь Каганец, які надаваў вялікае значэньне выяўленьню мінулага Беларусі ў сваёй творчасьці, праводзіць паралель між хуткаплыннасцю гісторыі народа і Нёманам, што сваёю няспыннасцю сымбалізуе ходу часу:

Ой, многа ж яна (рака — А.Б.)
З сабой унясла
Нашага шчасьця, славы і гора.

Для Купалы гісторыя свайго краю зьяўляецца неад'емнай часткаю ў працэсе асэнсаваньня сьвету, адной з істотных тэмаў яго творчасьці:

Не аб шумна-разгульнай бяседзе-вясельлі,
Не аб славе забытага краю,
Не аб віхрах і бурах, што сьветы цярпелі,
Гэту песьню сягоньня складаю.

Амаль заўсёды, і ў вышэй цытаваных вершах і ў наступных, дзе размова заходзіць аб мінуўшчыне, творцы імкнуліся правесьці кантрасную мяжу між тым, што было і тым, да чаго прайшла, ці больш дакладна, да чаго прывялі беларускую нацыю. Славутая мінуўшчына і занядбаная сучаснасьць паўсюдна ставяцца імі побач:

Так сьпіш, так жывеш мімаходам,
Мой край, як сьцяпная магіла,
З сваім незавідным народам,
З патухшай і славай, і сілай.

Гераізаваная, рамантызаваная мінуўшчына і цяжкі стан народнага жыцьця ў сучаснасьці, натуральна, вымушалі думаць пра неўладкаванасьць цяперашняга становішча, штурхалі да пошукаў выйсьця зь яго, спрыялі зьнікненьню комплекса нацыянальнай нявартаснасьці, скіроўвалі думку да ідэальных арыентыраў у палітычным развіцьці беларускага народа.

Канстанцыя Буйла, паэтка, грамадзка-палітычныя погляды якой былі цалкам адпаведныя канцэпцыі гістарычнага, культурнага развіцьця беларускай нацыі, выпрацаванай у грамадаўскіх, нашаніўскіх колах, пісала:

Мы ім песьню спяём, песьню зычну, як гром;
Ў ёй раскажам аб нашым народзе.
Ў ёй пець будзем аб тым, што было, ды, як дым,
Расплылося у віхравай хвалі, —
Тую славу-пачот, якой слыў наш народ,
Ды ўсё злыдні яму падрывалі...
Як забыўся пеяць, ўмее толькі стагнаць;
Песні болем яго налітые.
Хай жэ зычны наш спеў ўспомне ўраз, неўспадзеў
Яму прошласці дні залатые

Гістарычная канцэпцыя развіцьця беларускага народа тут дастаткова выразная: славутае мінулае беларусаў, іхнія "дні залатыя"; чужынцы, якія спынілі далейшае развіцьцё і, як вынік — цяжкая рэчаіснасьць. Канстанцыя Буйла бачыць задачу сваёй "песьні" ў прабуджэньні гістарычнай свядомасці беларускага народа, у тым, каб нагадаць яму пра мінулае, калі, у прыватнасці, беларус

Мовы дзедаў, бацькоў для гаворкі паноў
Не чураўся ў хацінцэ айчыстай.

Гэтыя ж мэты ставілі перад сабой і іншыя паэты-адраджэнцы. Паралель між тым, што мелі беларусы ў мінулым і сёньняшнім падаецца, часам, лаканічна, жорстка, з горыччу і злосьцю на свой народ, як, да прыкладу, у Купалы:

Глядзіце: прадзедавы косьці
У зямлю калісь за вас ляглі,
А вы, як збэшчаныя госьці,
Праклацьцем сталі той зямлі...
Забылі ўсё, згубілі долю,
Зьмяшалі славы цьвет з гразёй
І запрадаліся ў няволю

Купала папракае беларусаў, якія не здолелі адбараніць палітычныя, культурныя дасягненьні сваіх продкаў. У мінулым паэт знахо-

дзіць тыя агульнанацыянальныя каштоўнасьці, якія марыць убачыць узноўленымі ў сёньняшнім дні. Ім не аднойчы падкрэслівалася дэмакратычнае уладкаванне беларускай сярэдневяковай дзяржавы, што цалкам супадала з паглядамі беларускіх гісторыкаў. Так, М.Доўнар-Запольскі у "Асновах дзяржаўнасьці Беларусі" адзначаў: "Панаваўшый у Літоўска-беларускім гаспадарстве дзяржаўны лад — гэта лад рэспубліканскі з выбарным дажывотна прэзыдэнтам, каторы называўся вялікім князям".

Як адзін з дэмакратычных інстытутаў кіравання ў беларускай дзяржаве Купала згадвае веча — агульнанародны заканадаўчы сход:

Бай яму даўнейшы казкі,
Ад бацькоў сваёй зямлі...
Як на веча сход ззывалі
І тварылі свой закон.

У вершы "З мінуўшых дзён" паэт шкадуе пра заняпад дэмакратычных традыцый:

"Не гудзе ў павазе
Голас вечавы."

У час расійскай унітарнай дзяржавы пачатку XX ст. свядомая арыентацыя на рэспубліканскі лад старой Беларусі мела на ўвеце магчымасць і пажаданасьць адраджэньня мінулых правоў беларускага народу, што недвухсэнсоўна падкрэсьлівалася Купалам:

Слухалі князя, а князь што ня ўладзіў —
Слухаў, што веча яму звон казаў.
Чую, ах чую цяпер яшчэ ясна
Той неўгамонны, расходзіны звон...
Сьціх, занямеў, аглушылі напрасна;
Ці адзавецца калі болей ён?..

Вечавы звон у Купалы — сымболь народаўладзьдзя. Безумоўна, гэта паэтычны вобраз і адраджэньне яго для паэта — у першую чаргу ўзнаўленьне дэмакратычнага кіраваньня на Беларусі.

Народам жывучым у дэмакратычнай, прававой дзяржаве бачыліся беларусы і Андрэю Зязюлю, цікаваму, прызабытаму з ідэалягічных прычынаў беларускаму паэту-ксяндзу:

Меў князёў на загады,
Веча сходку на рады.
Іх суд мудры і правы
Вёў краёвыя справы
Бяз супрэчак і звалак.
Панаваў скрось парадак.

У супрацьвагу прыгнечанаму і бяспраўнаму становішчу беларускага народа на пачатку XX стагодзьдзя, паэты-адраджэнцы апявалі ягоную волю ды незалежнасць у сярэднявеччы, што не разыходзілася зь меркаваннямі тагачасных гісторыкаў. М.Доўнар-Запольскі адзначаў: "Найдаўнейшыя часы гісторыі Беларусі адзначаны панаваннем дэмакратычных ідэй у грамадзкім і гаспадарскім ладзе, найвышэйшая ўласць прыналежыць вечу, або народнаму сходу". Усё спазнаецца ў параўнанні. Побач існавала аўтарытарнае, нецярплівае да іншадумства Маскоўскае княства. Апроч усяго, як мы ўжо адзначалі, незалежная Беларусь была палітычным ідэалам, лягічным вынікам і мэтаю нацыянальна-вызваленчай барадзьбы, якую вялі лепшыя сілы беларускай нацыі.

Купала піша аб "войску Усяслава", полацкага князя, якое хадзіла

На той бой крывавы
За свой край, народ,

супрацьпастаўляючы яму новыя часіны, калі

Загасьціў лад новы,
Ды ня той, ня свой.

Жыцьцё беларусаў у вольнай сярэднявечнай дзяржаве паказвае паэт у вершы "Над Нёманам":

Край, дзе жыцыдё я сваё пачынаю,
Шмат весялей прыглядаўся на сьвет,
Песьні і казкі інакшыя баіў,
Шчасьце цьвіло ў ім, як макавы цвет.
Буйным жыцьцём усё чыста кіпела,
Слава далёка за мора ішла,
Ворага кожны за плечы браў сьмела,
Цемра чужынцаў ня страшнай была.
Пакам быў дома і слаўным за домам
Мой патаптаны сягодня народ;
Змог ён ня толькі знаць штукі з заломам, -
Роднаму слову ўмеў кніжны даць ход.

Купала падкрэсьлівае вольнасьць беларусаў у мінулым:

З вольнай дружынаю князь на пасадзе
Вольнаму люду законы пісаў;

Незалежны палітычна народ ня толькі "панам быў дома", але й "слаўны за домам", што адпавядае гістарычнай рэчаіснасці. Вялікае княства Літоўскае ў 14-15 стагодзьдзях было адным з найуплывовых дзяржаў у Эўропе. Адзначае Купала і прыярытэт нашых продкаў у кнігадрукаваньні на роднай мове, што, на яго думку, сведчыла пра

высокае развіцьцё культуры ў старажытнай беларуска-літоўскай дзяржаве.

Пісаў пра веліч старой беларускай дзяржавы і Карусь Каганец:

І мы самі ўжо не сьцямім,
Чым Беларусь была:
Што багата калісь была,
Між народаў слаўна,
Што навукай калісь слыла,
Вайной была спраўна.

Мінуўшчына свайго краю была для паэтаў-адраджэнцаў крыніцай нацыянальнага гонару. Спаважна і з годнасьцю апавядаў Алесь Гарун:

У старыну Беларус, ні падданы,
Гаспадарыў, быў сам над сабою
І далёка ў свеці быў знаны
За літоўскай і ляшскай зямлёю.
Але час прамінуў, і нядоля
На народ, як бы камень, зваліласъ,
Беларуская слава і воля
Адыйшла, адцвіла, закацілась

Ён згадвае магутнасьць і багацьце нашага краю, ролю і значэньне Вялікага княства Літоўскага ў гісторыі ўсяе Еўропы:

Меў вялікія клейноды,
Быў і моцны і багаты, —
Задзіўляліся народы —
А дазнаўся горкай страты.

Андрэй Зязюля, які ў сваёй паэме "Слова праўды" выклаў, пасутнасьці, кароткую гісторыю Беларусі на працягу стагодзьдзяў, так апісвае гэты пэрыяд:

Але згодна і міла
Сталі жыць два народы.
Іх князі дзеля ўгоды
Нашу мову зрабілі
Дворскай, ёй гаварылі,
У ёй уставы пісалі
суды адбывалі.
Слаўны Статут Літоўскі
І паргамін князеўскі
Аж да гэтуль ёсць сведкам,
Як было нашым прэдкам.

Як мы бачым, пытаньня пра існаванне "залатога веку" для нашых паэтаў-адраджэнцаў не было. Яны сьледам, а часам і разам з прагрэсіўнымі беларускімі гісторыкамі, ня толькі пагаджаліся з існаваннем дзяржаўнасці, незалежнасці ды магутнасці беларусаў, выражэнне чаго бачылі ў такіх палітычных утварэньнях як Полацкае княства ды Вялікае княства Літоўскае, у высокім узроўні культуры сярэдневяковай Беларусі, але й прапагандавалі гэтую ідэю, знаходзілі ў ёй гістарычнае абгрунтаваньне дэмакратычнага, незалежнага ладу будучай Беларусі, выхоўвалі моладзь (прыкладам, вышэйзгаданая паэма А.Зязюлі "Слова праўды" мае падзагаловак: "Пасвячаю беларускай моладзі") і наступныя пакаленні з мэтаю вяртаньня тых перавагаў у палітычным, дзяржаўным, культурным жыцьці, якімі валодалі нашыя продкі.

Асэнсаваньне сваёй мінуўшчыны, як мы ўжо заўважалі раней, неабходная ўмова ў вызначэнні далейшага накірунку развіцьця нацыі. У мінулым творцы бачылі не толькі далёкія часіны волі й незалежнасці, але і зьмяніўшыя іх стагодзьдзі прыгнёту, які цягнуўся да апошніх часоў. У вершы "Сон" Янка Купала бы ў сьне назірае за драматычнымі падзеямі ў сваім краі:

Збуджэньня дух махаў крыламі,
Няпамяць свой скідала пыл,
Вякі пражыты за вякамі
Ўставалі з попелаў магіл.
Сьпіхала ў долы праўду здрада,
За быт, за шчасьце йшла вайна,
Парад цягнуўся за парадам,
Жыла, ўмірала старана.
І бачыў я ваякаў сільных,
І бачыў подлых я трусоў,
І чуў кайданаў звон магільны,
І чуў я вольных кліч сыноў.

Гэты, на першы погляд, хаос, мае ў Купалы выразны накірунак — ад лепшага да горшага, ад "залатога века" да прыгнёту, на працягу стагодзьдзяў, калі ўсё "гінула памалу":

Пад навалай крыўдаў многія сталецьці
Мы нясьлі пакорна лямку беспрасвецьця.
Мы нясьлі — ўсё ныла, гінула памалу.
Аж ня нашай наша бацькаўшчына стала.

Усведамленне бездані, у якую быў кінуты беларускі народ на працягу стагодзьдзяў, было гэткім жа неабходным, як і ўсьведам-

леньне вяршыняў, на якія ён быў уздымаўся ў лепшыя часіны свае гісторыі. Купала з прыкрасцю пісаў пра гэты час паняволеньня:

Мы не жылі, як жывуць людзі, Гасьцінцам шчасьця не хадзілі. Ня зналі ўцехі нашы грудзі, Вянкоў мы славы не насілі. У вершы "Устань" ён заўважае: "Мяцеліцы нашу Айчызну заглушылі", адначасна маючы на ўвеце і існаваньне, так бы мовіць, папярэдняй "адлігі".

Адлік страты незалежнасці, волі, правоў беларускага народу пачынаюць ад часоў Люблінскай вуніі Вялікага княства Літоўскага з Польшчай. Вынікам адной з такіх вуній стаў шлюб Вялікага князя Ягайлы з польскай каралеўнаю Ядвігай, што як пачатак канца беларускай славы разглядае А.Зязюля:

Князь Ягелла з Ядвігай
Ажаніўся і лігай
Гэтай княжага роду
Зьвязь накінуў народу...

Пэрыяд заняпаду беларусаў расцягнуўся на стагодзьдзі, што выразна фіксаваў Купала. Не аднойчы менавіта ў гэткім адрэзку часу ён піша пра пакуты Радзімы:

Гэй ты, гэй, Беларусь, маладая старонка,
Што гібела, сталецьці ў бяспуцьці, ў пацёмках

Асэнсаванне пакутнага гістарычнага шляху Беларусі наводзіла на цяжкі роздум пра яе будучыну. Ці здалее край, столькі гадоў пазбаўлены незалежнасьці, адваяваць волю, пытаецца як у народа, так і ў сябе Купала:

Няшчасны край! чым быў, чым стаў, чым будзеш ты
З сваім век стогнучым народам?
Як нёс — нясеш ярмо ўпадку, сьлепаты
І зьмен чакаеш год за годам.

Тым ня менш, разуменьне дыялектыкі развіцьця нацый, жаданне паэта ўбачыць беларускі народ у новай гістарычнай іпастасі, надавала радкам Купалы незгасальны аптымізм:

Скінь лахманы, што доўгія векі
Ты валачыла з кастры, з палыну;
Зыйдзі з-пад дзікай зімняй апекі,
Што над табою строіла зьдзекі, —
Выйдзі спаткаці вясну!

- зьвяртаўся паэт да Беларусі.

Я.Купала ў няшчасцях народа вінаваціць ягоную долю:

Шмат лет не ручыла нам доля.
Крывымі вяла пуцінамі,
Ня маючы ласкі і жалю

Над нашай старонкай, над намі.

якая "чужыншчынай ціснула грудзі", а часам і адкрыта - "братоў-непрыяцеляў":

Сотні лет, непрыяцелем — братам прыбітая,
Зарастаючы зеллем чужым, як лазой сенажаць,
Ты ляжала няпамяці пылам пакрытая,
А народ твой быў змушай маўчаць і табой пагарджаць.

Вачыма маці-Беларусі Купала аглядае драматычны шлях беларускага народа:

Шлі векі. Магіла лягла пры магіле, —
Вада змыла наспы, крыжы пагнілі;
Гаротнасьцяй зможаны, ў крыўдзе, у бясьсільлі
Там прадзедаў косыді бяз часу ляглі.

Часам атаясамліваньне Купалам лёсу народу з сваім уласным жыцьцём дасягае такога ўзроўню, што ён пачынае дратаваць чужынцаў, якія, паводле Купалы прыгнятаюць Беларусь ад імя свайго лірычнага двайніка:

Сотні лет песьцім днямі і ночай
Госьця на шыі -
Зьмея, што з пуняў скарбы валоча
Скарбы чужыя.

Жыцьцё чалавека, паводле Купалы, зьнітоўваецца зь лёсам народу незалежна ад асабістай уладкаванасьці, і бядоты народу становяцца бядотамі кожнага беларуса, па-за часам і месцам ягонага быцьця:

Зьядае крыўда нас ад векаў,
Няма ні праўды ні парадку

Дзякуючы паглыбленню ў мінуўшчыну ў Купалы выспявае разуменьне беларускага народа як нечага адзінага і цэльнага, што ўзьнікла для вырашэння нейкай адной, агульнай, грандыёзнай задачы. Мінулае зьвіваецца з сучаснасьцю, зьяўляюцца героі-здані, якія чаруюць і прыцягваюць:

Як жывая рвецца песьня,
Лесам-пушчаю шуміць,
З забыцьця зьмятае плесьню,
Мох з мінуўшчыны ляціць.
Сьлед за сьледам ройным роем
Цені даўняга кладуць...
Князь за князем, бой за боем,
Як сягоньня, ў ход ідуць.

Надзвычай мала гістарычных рэмінісцэнцыяў у Якуба Коласа. Ён звычайна пісаў на аснове асабіста ўбачанага, пэражытага, у

адрозненьні ад Купалы, які часта мадэляваў сітуацыі, тварыў на груньце фантазіяй, ўяўленьня. Тым ня менш, некаторыя радкі Я.Коласа дазваляюць нам сьцвярджаць пра абазнанасьць паэта ў мінуўшчыне Беларусі, пра разуменьне ім дыялектыкі развіцьця беларускай нацыі. Таксама як і Купала, Колас вымяраў перыяд прыгнёту беларускага народу сотнямі гадоў:

Вісьне ночы змрок пялёнкай,
Вісьне ад вякоў,

Гісторыя Беларусі асэнсоўваецца ім як супольны, поўны ўнутранага сэнсу шлях да адзінай мэты:

Калі та ўступім у дом, што вякамі
Будавалі, вякамі ішлі,
Усцілаючы сьцежку касьцямі,
Каб свабодна ўздыхнуць мы маглі...

Натуральнае адсюль і адчуваньне Коласам сябе прадаўжальнікам дзеяў продкаў, спадкаемцам тысячагадовай гісторыі беларускай нацыі.

Беларускія паэты-адраджэнцы з вялікаю пашанаю ставіліся да гістарычнай спадчыны свайго народу, разумелі гісторыю як неад'емную частку духоўнай культуры нацыі, як падмурак у працэсе развіцьця нацыянальнае сьвядомасьці. Менавіта таму Купала не аднойчы спыняўся на такім балючым для беларусаў пытаньні як гістарычная няпамяць. Зьвяртаючыся да Бога, пералічваючы няшчасці, якія прыпалі на долю беларусаў, паэт апошнім доказам у гэтай трагічнай карціне называе адсутнасьць асэнсаваным беларусамі сваёй мінуўшчыны:

Ты ў цьвет сваіх нялічаных народаў
Мінуўшчыну і будучыню ўбраў,
А ў нас — караючы чужой свабодай —
Мінулае — і тое адабраў.

Нешчаслівым і нялітасцівым уяўляецца Купалу лёс нашага народу:

Хто мы, адбірала нам памяць,
Чужыншчынай цiснула грудзі,
Не раз падцікалася з думкай,
Што мы ўжо — ня мы і ня людзі.

Адсутнасьць гістарычнай памяці прыводзіць да страты нацыянальных асаблівасьцяў, абцяжарвае шлях абуджэньня народа. Купала ні раз і ні два зьвяртаецца да беларусаў, пытаючы і сцвярджаючы адначасова:

Тваё было тут панаванне...

Чаму свой край аддаў на глум?

Захавальнікамі мінуўшчыны, "памяткай дзён, што ў нябыт уцяклі" у Куппалы зьяўляюцца курганы. Гэты аб'ёмны вобраз у паэта нярэдка набывае сімвалічны сэнс. Курганы — сьведкі мінулай славы: Сьведкай — прадзедаў шкілеты, Курганы з кустамі.

Яны — скарбніца памяці:

Прадзедаў слава лазой зарастае,
Памяць мінуўшчыны дрэмле ў зямлі,

абаронцы тысячагадовай гісторыі народу:

Перайшло, мінула,
Што калісь жыло,
Ў курганах заснула,
Зельлем зарасло.
Пад магіл навалай
Дрэмле Русь, Літва, -
За той тая з хвалай
Легла галава.

Курганы ва ўяўленьні Купалы — таямнічыя схованкі гісторыі, якія зьмяшчаюць загадку быцьця нашага народу, гэта неразгаданыя выспы мінуўшчыны ў нашым жыцьці. Паэтава песьня можа прыадхінуць таямнічую заслону, і людзі пачуюць

Гоман—славу, чорнай хваляй
Што зьбіралі курганы.

Менавіта на сімвалічным кургане-падмурку продкаў Купала прапакуе адбудову новага пасаду:

Ты на бацькаўскім, моладзь, кургане
Узьнясеш нездабыты пасад,

маючы на ўвеце і пераемнасьць пакаленняў у дасягненні адзінай мэты і гістарычную спадчыну, без уліку якой немагчымы прагрэс нацыі.

Занядбаньне мінуўшчыны, гістарычная няпамяць у Купалы знаходзіць выяўленне ў вобразе разбурэння селянінам-беларусам кургана. Характэрызуючы беларуса як нацыянальны тып, Купала піша:

Устане ж, пойдзе полем, логам,
Будзе дыхту, будзе:
Пачапаў тупым нарогам
Кургановы грудзі.

Гэта не сьвядомае разбурэньне, а правалы ў гістарычнай памяці народа, гістарычнае калецтва, выклікане шматвекавым прыгнётам:

Араты ўсход нясе адлогам:
Курган чапаючы нарогам,
Ня ўспомніць прадзедавай песьні

Гісторыя ў Купалы вымяраецца і больш сціслым пэрыядам — адрэзак часу, які ў стане абхапіць памяць патрыярхальнай сям'і. Гэта прыкладна — сто гадоў — жыццё бацькі, дзеда, прадзеда. У вершы "Ліпа" Купала спрабуе акрэсьліць гэтых сто год, якія пражыла ліпа:

Сто лет — кавалак часу,
Не сто дней, не сто тыдняў,
Якіх зайшло праменаў,
Збадаці ўсё абрыдне.
Няшчасцяў, кляцьбы, плачу
Было, што Божа мілы!
Нябожчыкаў бяз ліку
Сыходзіла ў магілу.

Сто апошніх год для Купалы — час уваходжаньня беларускага народу ў Расійскую імпэрыю, што не палепшыла ягонае жыццё. Да духоўнага прыгнёту Палякоў дадаўся яшчэ расейскі прыгнёт, што адзначае і Андрэй Зязюля:

У падвойнай няволі
Жывучы, лепшай долі
Доўга, доўга чакалі
У жыцці мутнай хвалі.

Менавіта таму ўва ўсіх без выключэння выпадках, гэты час у Купалы афарбаваны ў песімістычныя, змрочныя таны:

Ідзі ў двор і там пану служы,
Як служыў і твой бацька, і дзед,

— піша ён, азіраючыся ў нядаўняе мінулае. Думаючы пра будучыну, марачы пра лепшае жыцыдё, Купала праводзіць мяжу між марамі і мінулым, чым яшчэ болей адцяняе мінуўшчыну:

І зажывём шчасьліва мы тады,
Як прадзеды век нашы не жылі.

Заслугоўваюць увагі, як своеасаблівыя замалёўкі, што дакладна перадаюць калярыт эпохі былой велічы, вершы Купалы "Замчышча" і "Запушчаны палап". Цяпер занядбаньне ды разбурэньне абхапілі гэтыя "памяткі дзён":

Спавіты няпамяці мглою
Руіны замчышча ляжаць;
Муры зарасьліся лазою,
Навокал балотная гаць.

Палац, "роскашы і працы многіх рук" заняпаў, як заняпала гісторыя, цяперашні дзень некалі вялікага краю. Яго ўладальнік, "кволы гаспадар", не памятае павучальнае велічы Зыгмунта, аднаго з Вялікіх

князёў у сярэднявеччы, і, у выніку, усё плесьнявее, "зніштажэньне ў кожан гзымс паўзе і кут".

Шырока выкарыстоўваючы гістарычныя матывы ў сваіх творах, беларускія паэты-адраджэнцы не маглі пакінуць па-за ўвагаю і канкрэтныя гістарычныя падзеі, асобаў, якія пакінулі свой сьлед у гісторыі Беларусі. Янка Купала ў вершы "Зь мінуўшых дзён" згадвае полацкага князя Усяслава, паказвае яго ў гераічным арэоле, змагаром "за свой край, народ". Максім Багдановіч робіць вольны пераклад "Песьні пра князя Ізяслава Полацкага" — урыўка са "Слова аб палку Ігаравым". У адной з пераказаных вершамі Карусём Каганцом легендаў паказваецца ўдалая для беларусаў бойка з крыжакамі.

Пра дасьведчанасьць Купалы ў старажытнай гісторыі нашай дзяржавы сьведчаць ягоныя згадкі пра беларуска-літоўскага Вялікага князя Гэдэміна. Апісваючы віленскую Замкавую гару з рэшткамі княскага замку, Купала заўважае:

Слаўны Гедымін,
Князь Літвы — літвін,
Душа чынная,
Многа лет таму,
У гэтым жыў даму,
Жыў з дружынаю.

І яшчэ раз прыгадвае Купала гэтага Вялікага князя, заснавальніка сталіцы ў Вільні: "Над Вільлёй, дзе сталіца была Гедыміна". Перакладаючы "Трох Будрысаў" А.Міцкевіча, Купала зноў піша аб Вялікіх беларуска-літоўскіх князях XIV стагодзьдзя — Альгердзе, Кейстуце і Скіргайле:

Ольгерд рускіх біць едзе,
Скіргел — ляхаў—суседзяў,
А князь Кейстут разгроміць Тэўтоны.

Першы верш у нашай літаратуры, прысвечаны Францішку Скарыну — "Безнадзейнасць" — напісаў Максім Багдановіч. Цэлы цыкл з шасьці вершаў "Старая Беларусь" у М.Багдановіча прысвечаны мінуўшчыне Беларусі. Сярод іх такія шэдэўры як "Летапісец", "Слуцкія ткачыхі".

Андрэй Зязюля не абмінуў у сваёй паэме "Слова праўды" такія зьявы, як падзел Рэчы Паспалітай у канцы 18 стагодзьдзя, адмену прыгону. Паўстаньне Кастуся Каліноўскага згадвае ня раз Янка Купала.

Як мы бачым, беларускія паэты-адраджэнцы, і ў першую чаргу такія волаты слова, як Янка Купала, Максім Багдановіч, Алесь Гарун ды іншыя, надзвычай уважліва ставіліся да адбіцця мінуўшчыны ў

сваёй творчасьці. На пераломным этапе станаўленьня нацыі, выяўлення яе гістарычнай сьвядомасьці — паглыбленне ў мінуўшчыну народа, аб'ектыўны паказ яго велічы і ўпадку меў выключна важнае значэнне. Зьвязваючы мінуўшчыну з сучаснасьцю, робячы яе неад'емнай часткай жыцьця нацыі (яскравы прыклад — верш М.Багдановіча "Пагоня", у якім сімвалічная старажытная Пагоня, як квітэсэнцыя духу нацыі, перамяшчаецца ў сучаснасьць), беларускія паэты-адраджэнцы гэтым самым перакідалі кладку ня толькі зь мінулага да свайго часу, але і ад сваёй эпохі ў будучыну, забяспечваючы непарыўную сувязь пакаленьняў — найістотную адзнаку духоўнага жыцьця нацыі.

* * *

З прычыны спэцыфікі сваёй працы — працы на беларускай мове, беларускія пісьменнікі аб'ектыўна ўжо рабілі на пазбаўленьне беларуса ад комплекса непаўнавартасны бо выконвалі адну з найважнейшых задач у пачатку станаўленьня нацыі — распрацоўвалі беларускую літаратурную мову, той духоўны інструмэнт, які дазваляе кожнаму беларусу ад Беластока да Смаленска адчуць рух крыві аднае нацыі ў сваіх жылах. Па-за гэтым укладам у разьвіцьцё сьведамасьці беларусаў, вялізную вагу меў пазытыўны нацыянальны запал, які ёсьць у творах паэтаў-адраджэнцаў, які сьведама накіраваны на вывад беларуса са стану "тутэйшага", на вызначэнне кожнага ў арганізме народа, а таксама мейсца народа з яго гісторыяй, культураю, мовай у міжнацыянальнай лучнасьці.

Праз зварот да нацыянальнага пытання, асэнсаванне якога і ў значнай ступені вырашэнне зьяўляюцца сфэраю духоўнага жыцьця народа, паэты-адраджэнцы выводзілі традыцыйную сацыяльную беларускую паэзію на новы ўзровень.

Парадаксальна, але ў творчасці беларускіх паэтаў др. пал. XIX ст., на якой грунтавалася паэтычнае адраджэньне пачатку XX ст., нацыянальнае пытанне, пытанне разьвіцьця беларускай культуры, мовы, магчыма, з-за правілаў беларускай паэтыцкай эстэтыкі, якая склалася на той час, амаль не ўздымалася. Крыху ў Францішка Багушэвіча, яшчэ меней у Дуніна-Марцінкевіча і Янкі Лучыны. Чаму так? Да прыкладу, у суседзяў-украінцаў ужо выспеў свой нацыянальны ідэоляг — Тарас Шаўчэнка. Але ўсяму, мабыць, свой час.

Задачы, якія стаялі перад беларускімі паэтамі ў др. пал. XIX ст., былі больш сціплыя і абмежаваныя. Яшчэ не стала самакаштоўнасьцю ідэя самавызначэння беларускай нацыі, яе кансалідацыі, усебаковага культурнага, палітычнага, сацыяльнага разьвіцьця на аснове сваіх уласных магчымасцяў. Падваліны гэтаму былі закладзеныя гісторы-

камі, этнографамі, лінгвістамі і, ведама ж, пісьменнікамі. Яны назапашвалі энэргію духоўнага нацыянальнага беларускага сьвету. І вось у 1893 годзе, амаль аднача сна з апошнім магіканінам выбітага паўстанцкага пакаленьня, Францішкам Багушэвічам, ягонага прадмоваю да "Дудкі Беларускай", Карусь Каганец, сын паўстанца, заяўляе:

Ой, гора жа, гора над намі,
А ўсяму вінаваты самі,
Бо мову прыродну мы забываем,
Апратку, звычай на чужы мяняем.
Гэй, да схамянемась,
Ды са сну прачнемась!

У тыя яшчэ гады паэта зьвяртаўся да беларускага народа:

За родну краіну, звычай і мову,
За гонар грудзьдзю ставайце!

Тэма абуджэньня беларусаў з нацыянальнага небыцьця — адна з найбольш выразных тэмаў, што праходзяць у ягоных раньніх творах. У 1899 годзе Карусь Каганец піша верш "Беларусь", у якім абвінавачвае дзяржаўны лад царскай Расеі ў нацыянальным генацыдзе у стасунках з беларусамі:

Хіба ты забыўся, як цар праваслаўны,
Айцец — бацюшка Расіі праслаўны —
Усім русінам прыказ такі даў
І рукою ўласнай яго падпісаў,
Што б русінаў не было болей на сьвеце,
А ўсе расіяне — маскоўскія дзеці,
А хто ся адважыць русінам ся зваці,
Таго у ссылку або расстраляці!

У 1904 годзе Карусь Каганец ужо выразна бачыць, як Беларусь,

Што нікне зь лятамі,
Ўзварухнецца, ўстрапянецца,
Узьвядзе плячыма,
Ў нову шату апранецца
І празрыць вачыма.

І тым самым годам пазначаны верш Цёткі "Намяці, але будзе", у якім яна абвяшчае аб праве народа на самастойнасьць:

Досі, крыкнем: "Мы у хаце,
Ў Беларусі, ў сваім краю.
Сьведкі — сонца, дубы з гаю,
Што ня вы, а мы панамі
Над зямлёю, над лясамі.

На мяжы 1905-06 гг. да вышэйназваных беларускіх паэтаў далучаюцца Янка Купала і Якуб Колас, якія адразу сталі лідэрамі ў беларускай адраджэнчай паэзіі. Газэты "Наша Доля" і "Наша Ніва" зрабілі вершы, што хадзілі ў рукапісах, набыткам шырокага кола людзей, дапамаглі зьвесьці асобныя паэтычныя ручаінкі ў адзіную плынь беларускай, адраджэнчай паэзіі. Яны фактычна пераўтварылі беларускае пісьменства са справы прыватнай (за невялікім выключэннем вершаў Цёткі, што разыходзіліся ва ўлётках, ды асобных вершаў К.Каганца і Я.Купалы, што друкаваліся ў менскіх рускамоўных прагрэсіўных газэтах) у зьяву грамадзкую, агульнанацыянальнага значэньня.

Затым на працягу 1905-07 гадоў у "Нашу Ніву" прыходзяць А.Гарун, М.Багдановіч, Ц.Гартны, З.Бядуля ды іншыя пазты-адраджэнцы.

Актывізацыя нацыянальнае сьведамасьці, накмечаная К.Каганцом ды Цёткаю, праца над якой зьяўлялася важнай часткаю ідэалягічнай праграмы БСГ і была неад'емным аспэктам усяго нацыянальна-дэмакратычнага руху на Беларусі, стала гэтаксама найважнейшай задачаю іншых беларускіх паэтаў, што далучыліся да гэтага руху, і найперш для нашага нацыянальнага генія — Янкі Купалы.

Гэтая праца, накіраваная на ўзьняцьце нацыянальнае сьведамасьці беларусаў, праводзілася беларускімі паэтамі ў шматлікіх кірунках, пачынаючы ад самага, здавалася б, элементарнага — замацаваньня за нацыяй агульнага найменьня БЕЛАРУСЫ. Доўгая адсутнасьць уласнае дзяржаўнасьці, традыцыйны падзел беларусаў па веравызнаваньню на каталікоў і праваслаўных, шавіністычная прапаганда расейцаў і Палякоў прывялі да таго, што згодна перапісаў на мяжы XIX-XX ст. шмат хто з беларусаў запісваліся тутэйшымі.

Адзін з нешматлікіх вершаў Ф.Багушэвіча Хрэсьбіны Мацюка", што прысвечаны праблеме міжнацыянальных адносінаў, як раз і закранае такі выпадак нацыянальнага зацьменьня "тутэйшага" чалавека, які адчувае сваю розьніцу ад этнічных расейцаў да Палякоў, але ня можа выказаць конча сваё асобные нацыянальнае Я. Гісторыя заканчваецца тым, што па прыналежнасці да каталіцкага касьцёлу "тутэйшага" чалавека запісваюць у палякі.

К.Каганец у вершы "Беларусь" (1899) адначасна з найменьнем беларус ужывае і гістарычнае найменне беларусаў — русін, аддзяляючы яго ад "маскоўцаў" — уласна расейцаў. Гэта сведчыць за тое, што пэўны назоў народа яшчэ ня быў вызначаны. У той час як у наступных вершах паэта ўжо адназначна прытрымліваецца агульнапрынятага найменьня — беларусы.

Тып беларуса, які яшчэ ня вызначыў для сябе — дык хто ўсё ж такі ён, сустракаецца ў розных вершах Я.Купалы. У вершы "Мой пагляд і мэта" з падзагалоўкам "з прыпевак тутэйшага", Купала малюе зборны вобраз беларуса-прыстасаванца, які і не жадае ведаць — хто ён. Супраць гэтых рысаў абыякавасці і нацыянальнага нігілізму і змагаўся Купала.

"Тутэйшы" — сам назоў верша ў Купалы мае трохі грэблівы прысмак. Гэта тып тубыльца надзвычай кансэрватыўны і ў традыцыях і ў вядзеньні гаспадаркі. Ён трохі сварлівы, трохі зладзеяваты, выпівае, цураецца навукі, адным словам, па ўласным вызначэнні, жыве "па закону і па веры". Нас цікавіць тая частка верша, якая мае адносіны да нацыянальнай сьведамасьці "тутэйшага", у прыватнасці, ягоныя стасункі з роднаю моваю:

Знаём з расійскай, з польскай мовай;
Сваёй з гасьцьмі ані мру-мру,
Хаця ня зрокся і "вясковай" —
"Папросту" з "простым" гавару,
З яе ж рабіць які парад,
За гэта дзякую ўжо я.

Як мы бачым, нацыянальная сьведамасьць у "тутэйшага" чалавека ў зародкавым стане і глыбей традыцыйнага захаваньня адрозьненьняў у мове ён не сягае. Да й яно сьведама хаваецца, бо можа прынесці адно толькі клопат.

Роднага ж краю тутэйшыя людзі
У скуру чужацкую лезуць жыўцом.

- гэтак апісвае Купала працэс выраджэння "тутэйшага" чалавека такога кшталту.

Не заўсёды ў Купалы найменьне "тутэйшы" было раўназначным спалучэньню "беларус-рэнегат". Часам яно ня мела экспрэсіўна-стылістычнай афарбоўкі, адно, канстатавала факт. "Хто ты гэткі? — Свой, тутэйшы." — перафразуецца Купалам польскае, агульнавядомае: "Kto ty jesteś? — Polak mały!» Жаданьне "тутэйшага "ня быць скотам" непазьбежна стасуецца і з ягоным нацыянальным станам. Яно сіметрычна жаданьню "беларусаў" у іншым купалавым вершы "людзьмі звацца". Пазбаўлены індывідуальных рысаў, абагульненьняў, але ўсё ж уперсалізаваны вобраз "тутэйшага" у вершы "Хто ты гэткі" — папярэднік "агромністай грамады" беларусаў, нацыі ў вершы "А хто там ідзе?".

Часам найменьне "тутэйшы" выступае ў Купалы як сымболь падкрэсьленага нацыянальнага адрозьненьня ад суседзяў, сымболь нацыянальнай годнасці:

Я не чыноўнік і ня граф, ня князь,
Таксама — я ня турак і ня грэк,
І нават не паляк і не маскаль,
А проста я тутэйшы чалавек!

І ўсё ж значна часьцей Купала ўжываў найменьне беларусы, этнонім Беларусь, спалучэньні беларуская мова, беларуская песьня ды інш. Ён актыўна выкарыстоўваў лексему беларус у сваёй творчасьці разам з іншымі пісьменьнікамі-адраджэнцамі, прапагандаваў яе, замацоўваючы у свядомасці народа і ў сьвядомасьці іншых нацыяў. Уважаючы на тую барацьбу, якую вялі шавіністычныя прарасейскія і прапольскія колы нават супраць самога слова беларус, супраць афіцыйнага прызнання назова ўсяго краю Беларусь, замест "Северо-Западного края" ці то "Kresów wschodnich". Трэба адзначыць асаблівую экспрэсіўную нагрузку, якую несьлі гэтыя словы ў творах пісьменьнікаў-адраджэнцаў, нават як на цяпер дык і ў зусім бязкрыўдных сітуацыях.

Вобраз беларуса ў Купалы заўсёды абагулены. Нават надзяляючы яго індывідуальнымі рысамі, Купала заўсёды імкнецца ўбачыць за ім народ, нацыю:

Я мужык-беларус, —
Пан сахі і касы;

- аповяд ідзе ад аднаго чалавека і як бы ад усяго народа.

Што ты сьпіш, што ты сьпіш,
Беларускі мужык?

- зьвяртаецца Купала да кожнага асобна і адначасна да ўсіх беларусаў.

Цямней, беларусе, ад ночкі асеньняй,
І шчасьце такое ж ты маеш...

- дакарае Купала кожнага і ўвесь народ.

У вершы "Аўтарцы "Скрыпцы Беларускай", прысвечаным Цётцы, пералічваючы яе заслугі, Купала піша: "Беларуса, й яго жонку называеш ты людзьмі". Гэта галоўнае, чаго дабіваецца Купала сваёй творчасцю для беларускага народа.

Часам вызначэнне нацыянальнасці ў Купалы набывае больш вузкі сэнс і адносіцца да сьведамых прадстаўнікоў нацыі, да беларускай інтэлігенцыі:

Дык і ты, як усе, спаткай году прыход,
Беларусаў сямейка худая.

- гэта сьведамыя беларусы. Менавіта ў такім сэнсе Купала піша пра С.Палуяна ў вершы, прысвечаным яму:

Як верыў, як да родных рваўся ніў і сёл

З душой і сэрцам беларуса! Асоба Палуяна па Купалу, ягоная душа і сэрца, адпавядаюць нейкай ідэальнай ва ўяўленьні паэта нацыянальнай выяве беларуса сапраўднага. Гэтай выяве належаць неабходныя, на погляд паэта, уласцівасці, якія павінен мець вартасны беларус. Вершык, дарэчы, доўгі час не друкавалі, мабыць лічачы рысы, акрэсленыя Купалам, не адпавядальнымі патрабаваньням камуністычнае ідэалёгіі. А да іх Купала залічае родную мову, павагу да нацыянальнай самабытнасці беларускага народа, веданьне гісторыі нацыі, працу на яе карысць, мужнасць у адстойваньні інтарэсаў нацыі. З парадаю выхоўваць гэтыя рысы ў дзецях зьвяртаецца Купала да беларускіх жанчынаў:

Гэта ўсё ўпаі дзіцяці
З малаком сваіх грудзей

Адсутнасьць акрэслена індывідуальных рысаў у апісаньні і паказе беларуса як асобы ў Купалы, абагуленасць гэтага вобраза, ягоная эпічнасьць набліжае беларуса-асобу ў паэзіі Купалы да беларусаў - нацыі, народу. І пачынаюць дзеяць адваротныя сілы. Беларускі народ у Купалы часта выступае як адзіны велізарны маючы душу арганізм. Досыць часта зварот Купалы да ўсяго народа, акрамя нейкіх канкрэтных мэтаў, меў значэньне эмацыйнага, ідэалягічнага фактара, які замацоўваў і ўзаконьваў "дэ факта" паняцьце-беларускі народ. Купала аб'ектыўна абгрунтоўвае, умоўна кажучы, уваскрашэньне беларускага народа, ягонае зьяўленьне на гістарычнай арэне, абвяшчае ягонае права на самастойнае вырашэнне ўласнага лёсу:

Кожны народ сам сабе пан;
І беларус можа зьмясьціцца
У сямьі нялічанай славян!...
Жыў беларус і будзе жыць!

Існаваньне беларускага народа Купала мянуе "яснай праўдаю". Менавіта гэтыя абставіны, упэўненасць у гістарычнай справядлівасьці надаюць веры паэту ў лепшую будучыню: "Я жыва! Народ мой са мною, пры мне!" Купала імкнецца таксама пераканаць у гэтым астатніх. Калі ёсьць народ — значыць жыве і будзе жыць Беларусь:

...З сваім людам ня дамся ў сваёй старане...
...Я ўзышла, расцвіла непагаслай зарой...

- вяшчае "маладая Беларусь". Купала падкрэсьлівае агромністасьць, масавасьць беларускага народа — аснову нацыянальнай самабытнасці, нацыянальнага духа, таго, што паэта мянуе "беларушчынай":

Як жыла і жывеш, будзеш жыць, Беларушчына:
Зразумеў і успомніў цябе твой мільённы народ.

Ёсьць у Купалы і больш выразнае вызначэнне агромністасьці беларускага народа: "Нас восем мільёнаў... зьлічы хто, шалёны!" Паэта ўпэўнены ў пазытыўным значэньні абуджэньня беларускага народа са стану нацыянальнай летаргіі. Ацэньваючы становішча і магчымасці беларусаў, Купала піша:

З сьцежкі — наперад, ня пойдзем назад...
Мы ўжо ня тыя, — інакшыя думы
Вырасьлі з намі, завуць к барацьбе.

Ад ініцыятывы нацыі, яе культурнай, працоўнай дзейнасьці залежаць яе аўтарытэт між іншымі народамі. Купала бачыць ствараль-ную сілу беларускага нацыянальнага руха, духоўны, нацыянальны патэнцыял свайго народа, пакліканага сьцьвердзіцца роўным між роўнымі:

І радзімым словам рукой мазалістай
Беларус упіша на старонцы чыстай
Кнігі ўсіх народаў важна, ў непрымусе
Сумную аповесьць роднай Беларусі.

Уважаючы на адсутнасьць нацыянальных дзяржаўных межаў, якія б аддзялілі беларусаў ад астатніх нацыяў, Купала вялікі акцэнт робіць на этнічную самабытнасць беларусаў, сваеасаблівасьць нацыянальнае псіхалогіі, што належыць цалкавіта самастойным нацыям:

На курганавым каберцы
Нечувалае чуваць,
Што ўсё можа толькі сэрца
Беларусава паняць.

Паэта ўпэўнены ў вялізных магчымасцях беларускае нацыі:

Пойдзе плавам песьня-казка
Ў сьвет аб нашай славе,
Дзіву дасца сьвет вялікі
Гэтакай праяве.
Хай сьвет знае, што патрапе
Без чужых прымусаў
Беларуса праца, сіла,
Сэрца беларуса.

Перад беларусамі стаяць пэўныя задачы, сфармуляваныя і выказаныя Купалам ва ўжо згаданым намі вершы "А хто там ідзе?" Галоўнае жаданьне беларусаў існуе ў тым, "каб людзьмі звацца". Купала бачыць шляхі дасягненьня гэтае мэты праз актыўнасць народа, ягоную барацьбу, да чаго і заклікае беларусаў:

Пейце, пейце а дружней,
Браці-беларусы,

Барукайцеся сьмялей
З няпраўдай, з пакусай.

Згадваецца Купалам і больш вузкая задача, якая адносіцца да цікаўнага для нас нацыянальнага аспэкта — нацыянальнага раўнапраўя:

Хочам папросту, каб лепш ручыла
Нашым хацінам, нашым прыплодам,
Каб стаць раўнёю славай і сілай
Іншым народам.

Пры ўсім пры гэтым Купала ня лічыць шлях да адраджэння беларускае нацыі нечым выключным. Ён знаёмы з разьвіцьцём нацыянальнага руху ў Славянаў (хоць бы нават праз тую ж "Нашу Ніву"), з ягонымі заканамернасьцямі (дастаткова згадаць выказванні праф. А.Пагодзіна, выдрукаваныя ў "Нашай Ніве" у N 9 за 1910 год: "але ці сустрэла хоць раз пагібель такі народ, які адчуў у сябе самім права на жыцьцё нароўні з іншымі? Можна сказаць, што новая гісторыя... ня ведае ніводнага такога прыпадку". Купала ўпэўнены ў неадольнай моцы адраджэнчага руху: Наша вярнуцца к нам мусіць, канешне, — Гэткі ўжо быту народаў закон.

Даволі добра ведамыя словы Купала пра прызначэнне свайго таленту, пазтавым мейсцы спаміж беларусаў:

Кожна край мае тых, што апяваюць,
Чым ёсьць для народа ўпадак і хвала,
А беларусы ж нікога ня маюць,
Няхаў жа хоць будзе Янка Купала.

Вось жа ізноў, сентэнцыя збудаваная на параўнанні беларусаў з іншымі народамі, ведама, у адным радзе, ведама, як роўнага з роўнымі. Менавіта з гэтага, вызначанага Купалам становішча розных народаў, якія маюць роўныя правы на істнаваньне і разьвіцьцё і вынікае няроўнасць беларусаў, якія ня маюць, каб ува ўсіх, сваіх песьняроў. Таму і зьяўляецца ў "мільённага народу" Янка Купала.

Спрадвечная забітасьць беларусаў уяўляецца паэту асноўнай перашкодаю на шляху да росквіту беларускай нацыі і таму побач з цытаванымі вышэй радкамі мы знаходзім у Купалы радкі незадаволенасці і крыўды на беларусаў:

А вы, адродкі Белай Русі,
Сьпіцё, як быццам кат засек!
До спаць! Паўстаньце грамадою...

Тут і дакор і заклік да вызвалення, адчуваньне непабуджанай, магутнай сілы народа.

Гэй, прасьніся, беларусе!

Усе людцы паўставалі.
Гэй, прасьніся, беларусе!
Усе праўдачку пазналі.

Тут і заклік Купалаў да абуджэньня з мэтаю спагнання нейкай вышэйшай нацыянальнай ісціны.

У вершы "Брату-беларусу" Купала крытычна ацэньвае сучасны стан беларускага народа, які не ўсвядоміў свайго прыгнечанага стану. "Чаму свой край аддаў на глум?" — пытаецца ў беларуса апірышча ягонае — зямля. Лес, бацька, лічы, папракае яго:

А ты, змарнелы чалавек,
Нікчэмны пасынак былога...
Прывучай кланяцца, ўніжацца,
Паганіш скарб свой дарагі.

Духоўнымі судзьдзямі Купалам абраныя зямля і лес — паняцьці пэўныя, устойлівыя і даўгавечныя, што памятаюць на іншае жыцьцё беларускага народа. Зараз — становішча іншае. І тое, што па перакананнях Купалы "Ад прыроды шлях свой мела", чужынцы "здушылі, збэсьцілі ўсё чыста". Вынікам векавога прыгнёту ёсьць гандаль беларускім народам, які ладзяць як свае рэнегаты так і замежная навалач:

Паганы зладзіўшы хаўрус,
Свае таргуюць і чужыя
Табой, няшчасны беларус.

Гандляры не даюць беларусам быць вольнымі, не даюць, словамі Купалы, "зірнуць арліна", не даюць узьняцца нацыянальнай думцы. Вось жа канстатацыя Купалам рэальнага патэнцыялу беларускай нацыі, не рэалізаванага з-за суб'ектыўных прычынаў, не прыніжае беларускі народ, а прыводзіць да высновы — пазбаўленьне гэтых прычынаў дазволіць разгарнуцца беларускай нацыі, у якой будуць і "узьлёты дум" і "арліны погляд". Ды пакуль што рэальнасьць дыктуе Купалу і такія пэсэмістычныя фантастычныя карціны, як продаж на рынку беларускае душы:

Паціху... не бойцеся — пойдзе ўсё гладка, —
Крый, Божа, якога прымуса.
Маленькая рэч, — як матыль ці стрынатка...
Усёй куплі — душа беларуса.

Без пануканьняў, з ягонае згоды, а мо' нават і самім беларусам прадаецца ягоная душа. Гандаль ідзе і ідзе. Уся Беларусь даўно перавернутая на вялізны кірмаш. Адкуль толькі бяруцца новыя сілы?

* * *

Праца беларускіх паэтаў па прышчапленьні ў народзе саманайменьня беларус шчыльна зьвязаная і з замацаваннем назову Беларусь за ўсім краем, які, назоў, нягледзячы на сваю багатую гісторыі і доўгі век, канчаткова ўсталяваўся толькі на пачатку XX стагодзьдзя. Любоў да роднага краю, Радзімы — абавязковая рыса ў складзе нацыянальна сьведамага чалавека. Пісьменьнікі-адраджэнцы здолелі ўкласці ў найменьне Беларусь самыя разнастайныя пачуцці, конча замацаваўшы лагічны ланцужок: родны край — Бацькаўшчына — Беларусь.

Даволі часта гаворка ў творах пісьменнікаў -адраджэнцаў ішла толькі пра родны край, які яны моцна любілі:

Я не знаю, я не знаю,
Чым я так прыкуты
Да тваіх, мой родны краю,
Вобразаў пакуты! (Колас)

і заклікалі да гэтага іншых:

Хай злыдні над намі скрыгічуць зубамі —
Любі сваю ніву, свой край,
І, колькі ёсьць сілы, да самай магілы
Ары, барануй, засявай!... (Купала)

Часам беларускія творцы імкнуліся даць як бы нэйтральны, аб'ектыўны ягоны відарыс, з прыхаванай шкадобаю да беднасьці і забітасьці краю:

Край наш бедны, край наш родны!
Лес, балоты і пясок...
Чуць дзе крыху луг прыгодны...
Хвойнік, мох ды верасок.
А туманы, як пялёнка,
Засцілаюць лес і гай.
Ой ты, бедная старонка!
Ой, забыты Богам край! (Колас)

А часам і не хавалі гэтую шкадобу, проста галосячы над ім:

Краю мой родны! Як выкляты Богам -
Столькі ты зносіш нядолі.
Хмары, балоты... Над збожжам убогім
Вецер гуляе на волі. (М.Багдановіч).

Яны не ўяўляюць сабе жыццё бяз гэтага забытага Богам краю, як дзіцё не ўяўляе сябе без маці:

Мілая, родная старонка—маці!
Моцна цябе я і шчыра люблю,
Бедныя ніўкі твае, сенажаці

І нішчасьлівую долю тваю. (Гарун)

Той самы Гарун, закінуты за гэты край у Сыбір, сумуе і нудзіцца аб яго:

Сэрца плача і я плачу;
Плачу с сэрцам галасьліва.
Дзе ты, дзе ты, краю родны?
Край далёкі, маці—Ніва?

Гэтая прыкутасьць да роднага краю ў вачох пісьменьнікаў-адраджэнцаў — абавязковая рысы ў station ўчым чалавечым характары.

Якіх ня роіў сноў аб старане сваёй,

- піша Янка Купала пра Сяргея Палуяна.

Усе вышэй згаданыя, а таксама многія іншыя прыклады найпрывязных пачуцьцяў да роднага краю, што дакляраваліся пісьменьнікамі-адраджэнцамі, акрамя духовай, эстэтычнай накіраванасьці, апроч натуральных памкненьняў людзей з абвостраным эмацыйным успрыйманнем, маюць таксама вялізны публіцыстычны, маральны запал. Рэчаіснасьць не прыўбіралася імі, наадварот паказваліся найбольш горкія яе бакі, ды гэта не замінала пісьменнікам ўва ўвесь голас заявіць пра бязмежную любоў да роднага краю, дзеля якога ня шкода страціць і жыцьцё:

Маці родная, Маці-Краіна!
Не ўсцішыцца гэтакі боль...
Ты прабач, Ты прымі свайго сына,
За Цябе яму ўмерці дазволь!..

- пісаў Максім Багдановіч, дакляруючы вышэйшы ўзровень самаахвярнасьці.

Выхоўваючы сярод чытачоў замілаванне да Бацькаўшчыны, пісьменьнікі-адраджэнцы спрыялі зьнікненьню ў беларусаў комплекса непаўнавартаснага народу, комплекса правінцыяналізму, абуджалі жаданьне працаваць на карысьць роднага краю.

Даволі часта ў творах пісьменьнікаў-адраджэнцаў сустракаюцца двайныя сінанімічныя найменні-родны край — Беларусь. Часам яны зьвязаныя толькі апасродкавана, як, напрыклад, у вершы Я.Купалы "Памяці Вінцука Марцінкевіча", які, на думку паэта

У тахт беларусавай думцы
Патрапіў запеці, зайграці

Які

Паслухаўшы сэрца, бярэ ён
Дуду беларускую ў рукі.

З паняцьцем беларускі ў вершы зьвязаны сам Дунін-Марцінкевіч. Далей Купала працягвае:

Жыве паміж намі дудар наш...
Жыць кожны так будзе, мой братку,
Хто родну старонку палюбіць,
Маўляў добры сын сваю матку.

Такім чынам паняцьці Беларусь і родная старонка не зьвязаныя наўпрасткі, ды паралель відавочная: "дудар наш", які сьпяваў беларускія песьні і пісаў пра беларусаў, — прыклад для нас у любові да нашага краю.

Часьцей гэны рад: родная старонка — Беларусь больш паслядоўны і ўзаемазалежны:

Убор вясновы, невыдумны,
Абычай сельскай прастаты...
Край беларускі мірны, сумны,
Свой родны край ці помніш ты?..

Купала піша аб тое, што "беларускі край" гэта ёсьць "свой родны край" для ягоных землякоў.

Родны край і Беларусь зьнітаваныя ў вершах Купалы "Я ад вас далёка"; Родная старонка і Беларусь — у вершы "Гэй, капайце, далакопы"...; Беларусь і свой край — у вершы "З песень аб сваёй старонцы".

Вось жа праз мастацкае слова Купала яднаў у сьвядомасьці чалавека, які чуў ці чытаў ягоныя вершы, чалавека "тутэйшага", паняцьці родны край і самастойны, адметны назоў гэтага краю — Беларусь гэткім чынам пераносячы ўсе пачуцьці, выказаныя ў вершах да роднага краю таксама й на Беларусь.

Паняцьце Беларусь узнімалася на геапалітычны ўзровень адметнай тэрытарыяльнай адзінкі і займала мейсца побач з Польшчай, Украінай, Расеяй.

Трэба адзначыць, што вершы з узгадкаю роднага краю пісаліся і друкаваліся разам з вершамі, дзе згадваліся адначасна родны край і Беларусь, што яшчэ болей спрыяла ўзаемнаму замацаваньню такіх паняцьцяў.

Купала ўжываў таксама такія паняцьці як Айчызна — Беларусь, падвышаючы стылістычна гэты сінанімічны рад. Айчызна — паняцьце больш сьвяточнае, якое мае афарбоўку дзяржаўнасьці, велічы:

Глядзіце, ўстае беларускі народ;
Айчызну будуе на борах, на нівах.
Што гэта? — то йдэі, то праўды прыход.

Адраджэнне Айчызны Купала лучыць з прыходам "ідэі". Мацуючы нацыянальны гонар беларуса за свой край, Айчызну, Купала папракае і сарамаціць тых беларусаў, якія не разумеюць гэтага:

Пасаромся, дэпутаце,
Хоць сваёй чорнай бялізны,
Ты ж другой, кром Беларусі,
Не павінен мець айчызны.

У гэтым на сэнсе паэта ўжывае паняцьце Бацькаўшчына:

Вярні нам Бацькаўшчыну нашу, Божа,
Калі ты цар і неба, і зямлі!

Вобраз Беларусі як самастойнай, незалежнай этнанацыянальнай адзінкі даволі часта сустракаецца ў творах паэтаў-адраджэнцаў. Мы зьвернем увагу, адно, на два вершы Купалы, супрацьлеглыя па настроі, але аб'яднаныя вобразам Беларусі.

У вершы "Маладая Беларусь" Купала паказвае працэс адраджэньня Беларусі, працэс няўхільнага ўздыму нацыянальнае сьвядомасьці народа. Паэта перакананы ў перамозе нацыянальнага руху:

Не з вясёласьці яснай, не з ясных палацаў,
А з канаючай крыўды ў пахіленай хатцы,
Вызываная праўдай, таптанай, жывой,
Я ўзышла, расьцьвіла непагаслай зарой...
І ад краю да краю ўсё далей і далей
Моц мая разальецца нязможанай хваляй...

Гэта адзін з самых аптымістычных, сьветлых, мяркую нават самаўпэўненых вершаў Купалы, калі паэта ня толькі прадказвае перамогу беларускаму нацыянальнаму руху, але й вынікі гэтае барацьбы: Грамадзянская згода, супольнасьць загосьце,

Аж усьцешацца прадзедаў цені і косьці,
Слоў унука ня зглушыць ніякі прымус,
Што ёй, роднай зямлі, верны сын, беларус.

І зусім іншы па танальнасьці, бы рэквіем, ягоны верш "Гэй, капайце, далакопы...", дзе хаваецца ўсялякая надзея на прагрэс, на перамогу:

Гэй, капайце, далакопы,
Яміну-магілу, —
А шырока, а глыбока,
Колькі хваціць сілы.
Так капайце днём і ночай,
Помачу склікайце, —
Бо ў тым доле хавацць будзем,
Беларусь хаваці.

Дзіва, што яшчэ Жыве Беларусь!

* * *

Важнае пытанне ў працэсе станаўлення нацыянальнай сьвядомасьці адыгрывае тырэтарыяльная сьвядомасьць — адчуванне і разуменне сваёй тэрыторыі, на якой жывуць гэткія ж людзі. Яшчэ больш важнае тым, што беларусы на пачатак стагодзьдзя ня мелі дзяржаўных межаў. Пасьля пытання — хто мы? натуральна паўставала пытанне — а дзе ж мы жывем?

Побач з навуковымі працамі ды публіцыстыкай, сьледам за прадмоваю да "Дудкі Беларускай", пра гэта пісалі і пісьменьнікі-адраджэнцы пачатку XX стагодзьдзя. Францішак Багушэвіч гэтак вызначыў тэрыторыю разсяленьня беларусаў: "Можа хто спытае: гдзе ж цяпер Беларусь? Там, братцы, яна, гдзе наша мова жывей: яна ад Вільні да Мазыра, ад Віцебска за малым не да Чарнігава, гдзе Гродна, Мінск, Магілёў, Вільня і шмат мястэчкаў і вёсак..."

Карусь Каганец спрадвечна беларускімі тэрыторыямі лічыць Панямоньне:

Штось Нёман наш ціхі прачнуўся,
У пасьцелі сваёй спеляхнуўся
І хвальку за хвалькай ціхенька пагнаў,
Ад краю да краю ганцоў ён паслаў,
Ад рэчкі да рэчкі,
Уздоўж і папярэчкі,
У Шчару, у Сулу,
У Лоту і Вусу—раку,

а таксама Палесьсе:

Па-над Шчарай і над Пцічам,
Над Бярозай і над Случам, —
Дзе та Прыпяць прабягае,
Піну, Горынь што прыймае.
Гэй, Палесьсе, Палесьсе!

Вызначальнай прыкметаю беларускай нацыі, межаў яе рассялення, для Купалы і для Багушэвіча зьяўляецца беларускамоўны абшар:

Дзе дом мой, народ мой, — з якога я краю, —
Паслухайце смутную повесьць маю.

— спавядаецца Беларусь -

З канца ў канец, дзе загнанае слова
Зьвініць беларуса, — ўладаньне маё;

Вось жа гістарычна ўтвораная неадпаведнасць межаў разсяленьня беларусаў з дзяржаўнымі межамі (прыкладна яны супадалі толькі ў 14-15 стагодзьдзях), нацыянальная няпэўнасьць значнай часткі беларусаў, робіць гэты прынцып ці не самым дакладным.

Я.Купала выказваўся і больш акрэсьлена:

А хто брат мне тут і друг,
Ладзь-наладзь душу і слух
І за песьняй думкай скоч
Там, дзе Нёман, Дзьвіна, Буг
Точаць наша поле, луг,
Дзе шумяць у сьвет далёкі
Белавежа, Налібокі...

Згодна з гэтым творам Купалы па нашай зямлі бягуць Нёман, Дзьвіна, Буг, на ёй шумяць Белавеская і Налібоцкая пушчы. Гэта і сапраўды складае значную частку беларускага этнаграфічнага абшару. Асноўныя са згаданых ім геаграфічных пунктаў — слупоў беларушчыны-паўтараюцца і ў іншых ягоных вершах:

З-над сонных вод Нёмна, з-пад хвой Белавежы,
Суседзі, суседкі, вітаю я вас!

- зьвяртаецца Беларусь да нацыяў-суседзяў.

Нёман у творах адраджэнцаў быў сэрцам, сымболем Беларусі. Радкі пра яго мы неаднаразова сустракаем у Каруся Каганца, Цёткі, Янкі Купалы, Якуба Коласа. Карусь Каганец, дапрыкладу, пісаў:

Ой, Нёман цячэ, Нёман плыве
Ад нас у літоўскія зямліцы.
А хто там пайме, хто разьбярэ
Шопат і гоман нашай рачыцы.
Купала ўтарыць яму:
Хай імчыцца наша песьня
Птушкай па-над гай,
Дзе бяжыць бурлівы Нёман,
Дзе наш родны край!

Я.Колас зьвяртаецца да Нёману:

Перарэзаў край ты родны
Беларуса-мужыка...
О, наш чысты, наш свабодны
Нёман, быстрая рака!

Нёман, рака, на якой узгадаваўся Я.Колас, паводле геаграфічных уяўленьняў паэта цячэ праз цэнтр Беларусі:

Вісьне скарга уздоўж Нёмна,
Беларусі сына.

Паэта ўважае Беларусі за "край з-пад Нёмана берагоў", стасуючы сюды і Вяльлю:

Дзе з Вяльлёю Нёман льецца
Між прыгожых берагоў...

Цётка таксама паказвае як на сэрца Беларусі на Нёман і Вяльлю:

Далёка, далёка, дзе сьняцца мне чары,
Дзе боры густыя над Немнам шумяць;
Дзе пацеркай белай Вільля прабягае,
Дзе Вільня між гораў гняздо сабе ўе.

Ужыванне канкрэтных геаграфічных назоваў спрыяла замацаваньню ў масавай сьвядомасьці іхняй прыналежнасці да Беларусі. Карусь Каганец удадатак да вышэйпералічаных назваў згадвае таксама пра Дзьвіну і Сож, Бярозу і Ольсу.

Як пра родны край, пэўную частку Беларусі піша Я.Колас пра Палесьсе, дзе ён быў настаўнічаў:

Я далёка цяпер
Ад палескіх раўнін,
А люблю ж я той край,
Бы яго родны сын...

Гэтаксама часткаю Беларусі лічыць Палесьсе Карусь Каганец:

Браты мае родныя,
Браты мае — братанькі,
Хлопцы — беларусікі,
Палесься казачанькі!

Выпрацоўцы нацыянальных геаграфічных арыентаваў дапамагаў і такі чыннік, як супрацьпастаўленне, вызначэнне чужых, не беларускіх пунктаў нацыянальнага апірышча. Менавіта таму для замацавання ў нацыянальнай сьвядомасьці беларусаў нянаскасьць, чужынства двух суседніх нацыянальных цэнтраў і гучэў рэфрэнам у Купалы праз усе вершы матыў Масквы і Варшавы, Віслы і Нявы (Волгі):

Вісла адным усьміхаецца ласа,
Тыя заплюшчыўшысь пруцца к Няве...
Дзе ўжо лет сотні Масква і Варшава
Торг груганоўы вядуць між сабой.

Адмяжоўваў Купала ад Беларусі — цэнтра сусьвету для беларусаў, пункту адліку ўсяго існага — і такія геаграфічных паняцьці як захад і ўсход, што адпавядала разьмешчаньню Польшчы і Расеі:

Добра вядомы і путы і пугі,
Песыдіў якімі ваш Захад і Ўсход.

Гэтыя Захад і Ўсход добра папрацавалі ў наступныя гады, каб зьмяніць геапалітычную арыентацыю ў беларусаў. І дзіўна гучыць

увушшу школьнікаў назоў і зьмест главы Я.Коласа з "Нашае Зямлі" — "Дзядзька ў Вільні". Натуральна, бо што яму было рабіць у літоўскім Вільнюсе. Ці такі факт з гісторыі Беларусі, як абвешчаньне БССР у Смаленску — а чаму за мяжою? Я ужо не кажу пра Беласток ці Даўгаўпілс, які ж некалі гучэў у беларускім вусе як Дзьвінск. А, й нават Менск стаў Мінскам. Для бальшавіцкіх гандлёвых эксперымзнтаў слабая нацыянальна Беларусь сталася добрым палігонам.

* * *

Беларускія паэты-адраджэнцы надавалі выключна вялікую ўвагу беларускай мове, разумеючы яе мейсца ў працэсе нацыянальнага адраджэньня. Апроч натуральнага жаданьня бачыць родную мову, абраную імі як інструмэнт у творчасьці, разьвітай, роўнай сярод іншых, пісьменьнікі-адраджэнцы разумелі вялізнае ідэалягічнае значэньне агульнанацыянальнай мовы, якая зьяўляецца асноўным духоўным апірышчам нацыі. Яны адзначалі вялікую ролю роднае мовы ў захаваньні адметнасьцяў псыхікі, культуры беларускага народа.

Пад навалай крыўдаў многія сталецьці
Мы нясьлі пакорна лямку беспрасьвецьця...
Адно ты нам, слова, засталося верным,
Каб вясьці з упадку к радасьцям нязьмерным.

- пісаў Купала. Пра тое ж пісаў і Алесь Гарун:

Можы-б ты і памёр і загінуў,
Каб ні вешчая мова Баяна...
Бо што бачылі госцікі-гэрцы
І зямлю, і лясы, і кілімы, -
Усё забралі. А мову ў сэрцы
У сваім сэрцы хавалі-нясьлі мы.

З роднаю, самабытнаю моваю, захаваньне якой расцэньвалася адраджэнцамі як вялікае шчасьце, беларускі народ падыйшоў да свайго шматбаковага адраджэньня. Менавіта мова зьяўляецца адною з асноваў у гэтым адраджэньні. Але далёка не сярод усіх беларусаў адносіны да мовы былі свядомымі. Даволі часта яны пагаджаліся з тым, што беларуская мова — вясковая, няўклюдная, няпрыдатная для шырокага ўжытку. Купала ў "прыпеўках тутэйшага" выводзіць гэткі тып беларуса:

Знаём з расійскай, польскай мовай;
Сваёй з гасьцьмі ані мру-мру,
Хаця ня зрокся і "вясковай" —
"Папросту" з "простым" гавару.

Паэта выступаў супраць абмежаваньня сфэры ўжывання беларускай мовы, іранізуючы, а часам і жорстка папракаючы "тутэйшага чалавека", ставячыся ледзь не з нянавісьцю да ягонае рабскае натуры:

А ты, змарнелы чалавек,
Нікчэмны пасынак былога,
Сваю пушчаеш песьню ў зьдзек,
Чужою славіш нават Бога!

Адраджэнцы заклікаюць беларусаў зьберагаць сваю мову, разумеючы, што ад яе існаваньня залежыць і жыццё нацыі:

Ты, мой брат, каго зваць Беларусам,
Роднай мовы сваёй ні цурайся...
Дык шануй, Беларус, сваю мову —
Гэта скарб нам на вечныя годы;

Адной з умоваў будучага справядлівага жыцьця беларускага народа пісьменьнікамі-адраджэнцамі ўяўлялася вольнае валоданьне народам беларускаю моваю, існаваньню якой ужо і тады пагражалі суседнія мовы. Я.Колас пісаў:

Няхай родным словам шчасна Загаворыць наш народ. Ад мовы, сьцьвярджае Купала, залежыць самабытнасць культуры народа, ягонае аблічча сярод іншых нацыяў:

Як жыло ты з намі — будзеш вечна жыці,
Грамадой мільёнаў з сьветам гаманіці...

Паэтамі-адраджэнцамі добра ўсьведамлялася аб'ектыўная каштоўнасць роднае мовы ў кантэксьце сусьветнае культуры:

За пашану радзімаму слову
Ушануюць нас брацця-народы!

Купала вылучаў адукацыйную, асьветніцкую функцыю мовы для свайго народу, а таксама яе рэпрэзэнтатыўную ролю ў міжнацыянальных адносінах:

І бяз песень жа народ
Што ён варт быць можа?
Ён і цёмны, як той скот,
І бяды ня зможа.
Газэт, кніжак мовай чэй
Найболей друкуюць,
Паважаюць тых людзей,
Любяць і шануюць.

Значэнне беларускае мовы разумелі і ворагі беларускага адраджэньня. Менавіта таму яны імкнуліся скампраметаваць яе. Да публіцыстычнай палеміцы ў прэсе падключаліся і беларускія паэты. Янка

Купала свой верш "Ворагам беларушчыны" прысвяціў канкрэтнаму матэрыялу А.Уласава, рэдактара "Нашай Нівы", дзе той бараніў правы беларусаў на родную мову.

У вершы Купалы і ў артыкуле Уласава — адныя і тыя ж матывы, але выказваліся яны роднымі сродкамі. Параўнаем. А.Уласаў піша:

"Але-ж як беларус стаў трохі на свае ногі, як ён пазнаў у сабе чалавека і грамадзяніна, роўнаго ўсім, як пачалося адрадзэньне беларусоў, пайшлі кніжкі і газэты беларускія, — вось тады заварушыліся тут і палякі, і рускія: знайшоў беларус меж імі малую жменю прыяцелёў, але ворагаў дык вялікую грамаду."

Купала ў сваю чаргу угарыць яму:

Чаго вам хочацца, панове?
Які вас выклікаў прымус
Забіць трывогу аб той мове,
Якой азваўся беларус?
Чаму вас дзіка яго мова?
Паверце, вашай ён ня ўкраў,
Сваё ён толькі ўспомніў слова,
З якім радзіўся, падрастаў.

Як бачым, у Купалы атрымліваецца больш рэзка, больш эмацыйна, адным словам, на гэтую праблему паглядзела душа мастака. Калі А.Уласаў даследуе, аналізуе становішча, Я.Купала болей дае такога матэрыялу для дасьледваньня, праўда, абодва яны прыходзяць да аднае высновы: "Няма на што беларусу рабіцца рускім ці палякам: ён можа астацца беларусам і астанецца" (А.Уласаў);

Эх, кіньце крыўдамі карміцца, —
Кожны народ сам сабе пан;
І беларус можа зьмясьціцца
Ў сямьі нялічанай славян!

Гэтаксама супраць нападаў на родную мову Купала выступае ў вершы "Роднае слова", вінавацячы ворагаў беларускае мовы ў амаральнасьці і безчалавечнасьці:

Або той сьмяецца, хто ня знаў ніколі
Чалавечых думак, чалавечай долі, —
Хто ў грудзях гадуе злосна, непрытворна
Замест сэрца — камень, мест душы — дым-чорны.

Ацэньваючы становішча беларускай мовы ў грамадзтве, Купала адзначае шчыльную сувязь яе з лёсам беларускага сялянства, іхні аднолькава прыгнечаны стан:

З нас самых і з гутаркі нашай
І свой, і чужынец стаў кпіці.

Разам са сваім носьбітам і ахоўнікам, беларускім сялянствам, беларускае слова прайшло праз стагодзьдзі і зьявілася выразьнікам беларускага нацыянальнага духу, сьцьвярджае Купала:

Ты зжылося з намі, бацькаўскае слоўца,
Як бы корань з дрэвам, як бы з небам сонца...
І мы самі нават мо' не спазнавалі,
Як у думках нашых цябе гадавалі...

Менавіта роднае слова здолела захаваць нацыю, мяркуе паэт:

Край стопчуць, заграбяць чужыя народы, —
У песьнях жа родны край, родныя словы
Жылі, і жывуць, і жыць будуць заўсёды.

Верш, песьня — зьяўляюцца квінтэсэнцыяй, вышэйшым эстэтычным, духоўным дасягненьнем мовы, што ў сваю чаргу служыла народу-носьбіту гэтае мовы:

Гэй, ты маці, родная мова,
Гэй, ты звон вялікі, слова,
Звон магучы,
Звон блыскучы,
З срэбра літы,
З злота зьбіты,
Загрымі ты,
Загрымі!
Гэй, званар, званар мой пане,
Бій у звон, як змогі стане.

- гэтак коратка і канцэптуальна, з вялікім эстэтычным эмацыйным запалам А.Гарун акрэсьліў значэнне роднае мовы і свае адносіны да яе, а таксама значэнне паэтычнага слова ды наканаванасьць таленту.

Купала зьвяртаецца да песьняра-беларуса і заклікае яго:

За родну песьню будзь ваякай...

Station Становучай якасьцю паэзіі Цёткі Купала лічыць чысьціню яе мовы:

Аб чымсь сьветлым, аб чымсь новым
Твая скрыпка грае нам;
Грае, грае, а ў ёй мова
Наша чуецца бяз плям.

Надзвычай важнай задачай, якая аб'ектыўна апраўдвае існаваньне паэзіі ва ўласных вачах, Купала лічыць уздым прэстыжу беларускае мовы сярод беларусаў праз вершы, супрацьстаяньне моўнай, культурнай асіміляцыі беларусаў:

Буду пець я свае песьні...
Каб на полі ці на лузе,

Ці працуючы ля дому,
Ці у лесе, ці пры плузе
Пеў ён песьні па-сваёму!
Каб ніколі не чураўся
Сваёй родненькае мовы,
У якой узгадаваўся,
Хоць забыўся дзеля новай.

Для Алеся Гаруна страта нацыянальнае мовы зьяўляецца жахліваю згубаю для нацыі. Клопат аб яе захаваньні ляжыць на плячох кожнага, а насамперш на паэтавых плячох:

Браточак мой! ах каб ты ведаў —
Страшэнна гэта рэч... гатовы
Хутчэй дык я на сьмерць лютую,
На вечны ў пеклі цяжкі мукі —
Зьмяніць, чым мову на чужую,
Здрадзіцелем чым быці ўнукаў!..

Чысьціня замыслаў беларускіх паэтаў-адраджэнцаў, іхняя прынцыповая пазыцыя ў адносінах да роднае мовы, уласна іхняя творчасьць на беларускай мове спрыялі маладому беларускаму адраджэньню адразу й назаўсёды зьнітаваць сваё разьвіцьцё з разьвіцьцём і ўмацаваньнем становішча роднае мовы. Гэты быў дальнабачны крок, вынікі якога на той час ня мог мабыць прадбачыць ніхто. Пасьля фізычнага гвалтоўнага зьнішчэньня хваляў беларускага адраджэньня гепеўшнікамі ды санацыяй, а затым фашыстоўцамі ды эмдэбэшнікамі, менавіта на падвалінах беларускае мовы адбывалася кожнае чарговае адраджэньне нацыянальна сьведамых беларусаў, якія зноў былі гатовыя йсьці на сьмерць. І вось таму менавіта ў 50-я гады пачаўся брутальны наступ на аснову нацыі — беларускую мову. Новаму пакаленьню сьведамых беларусаў ня варта забываць на каштоўны вопыт сваіх папярэднікаў.

© OCR: Камунікат.org, 2013
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2013
© PDF: Камунікат.org, 2013

**ЗМЕСТ**

Беларуская літаратура і Беларуская Сацыялістычная Грамада
"Будучнасьць" у беларускай паэзіі пачатку XX стагодзьдзя
Нацыянальная сьвядомасьць і беларуская літаратура на пачатку XX стагодзьдзя
Мінуўшчына нашага краю ў беларускай паэзіі пачатку XX стагодзьдзя

Рэдактар С Рагойша